Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
14 КРАСАВІКА 2015 г. АЎТОРАК № 70 (27928) Кошт 1800 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Каму ў банк хадзіць неабавязкова**

СТАР. 6



**Вера Брэжнева: і спявачка, і пасол**

СТАР. 9



**Мужчыны-«мача» больш не ў модзе**

СТАР. 13

*ЛІЧБА ДНЯ*

**2,5 тысячы**

*навучэнцаў і студэнтаў працаўладкуюць у вольны ад вучобы час у Мінску, паведамілі ў Камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама. Аж да лістапада навучэнцаў і студэнтаў гатовыя прыняць на работу больш за 130 арганізацый горада. У асноўным гэта ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі, цэнтры дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, а таксама Мінскі заапарк. Тут маладым людзям прапануюць прыняць удзел у добраўпарадкаванні і азеляненні тэрыторый, вырабляць швейныя вырабы, сувеніры, паўдзельнічаць у нарыхтоўцы корму для жывёл. Аплата працы школьнікаў і студэнтаў у гэтых установах пагадзінная. Мінімальная стаўка за гадзіну складае Br12405. Такім чынам, мінімальная зарплата моладзі ва ўзросце 14-16 гадоў складзе крыху больш за Br1,3 млн, ва ўзросце 16-18 гадоў — каля Br2 млн.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.04.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 14440,00 | ▼ |
| Еўра | 15310,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 277,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 643,92 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# УРОКІ ПАМЯЦІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Трасцянец. Красавік 2015 года.

■ Жыллё

## ТАННА І ЯШЧЭ ТАННЕЙ...



Да сярэдзіны жніўня сярэдні кошт продажу кватэр у сталіцы можа знізіцца нават да ўзроўню 14,7-16,2 млн рублёў (1000-1100 у. а.) за квадратны метр

**Крыху больш за месяц таму наша выданне ўжо рабіла доўгатэрміновы аналіз развіцця другаснага рынку сталічнай жыллёвай нерухомасці сумесна з пастаянным экспертам газеты. Тады мы прагназавалі зніжэнне цэннікаў на кватэры (прыкладна на 10-15%), таму чакалі летам сярэдні кошт квадратнага метра «немаладых» кватэр на ўзроўні 18 млн рублёў (недзе каля 1200 у.а.). Аднак за гэты час сітуацыя крыху змянілася... Сёння кіраўнік агенцтва «БепЦТН», старшыня рады Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ паспрабуе ўдакладніць сітуацыю на мінскім рынку жылля і скласці прагноз па ім на бліжэйшыя 3-6 месяцаў.**

### ПРАПАНОВА ПРАЦЯГВАЕ ПАВЯЛІЧВАЦЦА

Калі ў студзені пакупнікі яшчэ набывалі кватэры, якія яны выбралі да валютнага скачка летась, то ў апошнія два месяцы рынак другаснага жылля амаль «замарозіўся». Цяпер у горадзе за месяц прадаецца каля 200-300 кватэр, што недзе на 40% менш, чым у папярэднія гады. Падобнае развіццё падзей тлумачыцца адразу некалькімі фактарамі. Па-першае, пасля мудрагелістай дэвальвацыі кошты ў рублях на кватэры другаснага рынку жылля імгненна скокнулі ўгору і сталі несуадноснымі з кішэняй сярэднестатыстычнага беларуса. Попыт на жыллё сур'ёзна знізіўся. Па-другое, ужо больш як чатыры месяцы запар расце колькасць прапановы кватэр на продаж. Цяпер агульны спіс прапановы ў Мінску складае больш як 11,7 тысячы кватэр і асобных жылых памяшканняў.

СТАР. 8

■ Надвор'е

## ХОЛАДНА, ВЕТРАНА І ДАЖДЖЛІВА

### А ўначы на сераду прагназуецца і мокры снег

**На тэрыторыю нашай краіны на працягу ўсяго тыдня будзе паступаць выключна халодная паветраная маса з боку Паўночнай Атлантыкі, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Таму ў аўторак ападкі (пераважна ў выглядзе дажджу) чакаюцца ў большасці раёнах краіны. Усталюецца моцны паўночна-заходні вецер з парывамі да 15-20 м/с. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе 5-11 цяпла. У сераду сур'ёзныя дажджы будуць ужо на ўсёй тэрыторыі краіны, а ўначы на сераду — месцамі дождж з мокрым снегам. Раніцай і ўдзень у паўднёва-заходніх рэгіёнах Беларусі захаваецца моцны вецер (да 15-20 м/с). Стане яшчэ халадней. Тэмпература паветра ўначы на сераду складзе ад мінус 3 да плюс 4 градусаў, а ўдзень — плюс 5-10 градусаў, па паўднёвым захадзе да 13 цяпла.

Даволі складаныя ўмовы надвор'я будуць і ў чацвер. Крыху пацяплее, але будзе некамфортна на фоне моцнага ветру і кароткачасовага дажджу. Дарэчы, у многіх раёнах хуткасць ветру будзе дасягаць 15-20 м/с, а ўдзень па паўночным усходзе — парывамі да 23 м/с. Тэмпература паветра ўначы на чацвер складзе плюс 2-9 градусаў, удзень — 6-12 цяпла, на поўдні Брэсцкай і Гомельскай абласцей — да плюс 16 градусаў. Аднак напрыканцы тыдня зноў будзе халаднавата.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пятніцу часам чакаюцца ападкі (пераважна дождж). Тэмпература паветра ўначы складзе ад 0 да плюс 7 градусаў, удзень — 5-12 цяпла. На выхадныя стане яшчэ халадней. Часам будзе ісці дождж з мокрым снегам. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, удзень у суботу і нядзелю — 4-10 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# МІР І СПАКОЙ ГАРАНТАВАНЫЯ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў свята Вялікадня наведаў храм у гонар Нараджэння Прасвятой Багародзіцы ў Оршы. Кіраўнік дзяржавы прысутнічаў на велікодным богаслужэнні, а потым паразмаўляў з прыхаджанамі, паведамляе БЕЛТА.**

Прэзідэнт пажадаў прысутным здароўя і добрага настрою. «Калі ў вас будзе добры настрой — у нас усё атрымаецца», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што Беларусь была і застаецца мірнай краінай. «Мы ваяваць не збіраемся. А калі некаму захочацца, мы годна яго сустрэнем. Але такіх ворагаў у нас пакуль няма, — падкрэсліў ён. — Таму жывіце спакойна. Усё ў нас наладзіцца».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што па добрай традыцыі адзначае Вялікдзень у розных рэгіёнах Беларусі. Сёлета Прэзідэнт наведаў у светлыя велікодныя дні сваю малую радзіму.

Аляксандр Лукашэнка перадаў у дар храму Нараджэння Прасвятой Багародзіцы абраз «Спас Уседзяржыцель» майстра Дзмітрыя Палуянава. На гэтай іконе Ісус Хрыстос у левай руцэ трымае Евангелле, правая прыўзнята ў блаславенні. Кіраўнік дзяржавы атрымаў у дар жыватворны абраз «Тайная вячэра», выраблены майстрамі Куцеінскага брацтва.

# АДКБ НЕ ПАВІННА ПЕРАТВАРЫЦЦА Ў ЧАРГОВЫ ФАНТОМ

**На гэта звярнуў увагу Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з генеральным сакратаром АДКБ Мікалаем Бардзюжам, паведамляе БЕЛТА.**

Аляксандр Лукашэнка папрасіў Мікалая Бардзюжу выкласці бачанне сітуацыі, якая складваецца на постсавецкай прасторы і, у прыватнасці, у АДКБ. «На што, з вашага пункту гледжання, нам трэба было б больш істотна рэагаваць, якія пытанні не вырашаюцца?» — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Прэзідэнт Беларусі адзначыў, што хацеў бы абмеркаваць і шэраг іншых пытанняў, якія ўплываюць на сутнасць спраў арганізацыі, «каб яна не ператварылася ў чарговы фантом».

Мікалай Бардзюжа далажыў аб бягучай дзейнасці АДКБ, планах, якія адпрацаваны і рэалізуюцца. На сустрэчы падрабязна была разгледжана сітуацыя, якая сёння ў цэлым складваецца на прасторы дзеяння Дагавора аб калектыўнай бяспецы, аб няпростым становішчы ва Усходне-Еўрапейскім, Цэнтральна-Азіяцкім рэгіёнах, а таксама аб замарожаных канфліктах.

«Праблем даволі шмат. Яны павінны ўлічвацца і адсочвацца, што мы і робім. І мы павінны рабіць прэвентыўныя крокі, якія забяспечылі б магчымасць нейтралізацыі тых ці іншых пагроз, з якімі могуць сутыкнуцца нашы краіны», — адзначыў Мікалай Бардзюжа.

Прэзідэнту таксама далажылі некаторыя прапановы наконт ваеннага супрацоўніцтва, шэраг з якіх Аляксандр Лукашэнка зацвердзіў.

■ Сяўба

# Што пасееш, тое і... надоіш

## Плошча шматгадовых траў павялічыцца больш чым напалову



**Аграрыі пяці абласцей Беларусі (акрамя Віцебскай) завершаць сяўбу ранніх яравых збожжавых і зернебабовых на працягу 2-3 дзён, паведаміў намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзімір ГРАКУН.**

### АПТЫМАЛЬНЫЯ ТЭРМІНЫ

Намеснік міністра адзначыў, што ў краіне актыўна ідзе сяўба яравых культур. Плошча яравой сяўбы сёлета складае 2 млн 420 тыс. га, з якіх 1 млн 200 тыс. га запланавана пад збожжавыя культуры, 959 тыс. га — пад раннія яравыя збожжавыя і зернебабовыя. Па звестках на 13 красавіка, яны пасеяны на 749 тыс. га. «Такім чынам, 5 рэгіёнаў завершаць сяўбу ранніх яравых збожжавых і зернебабовых на працягу 2-3 дзён. Застаецца адна вобласць — Віцебская, якой спатрэбіцца яшчэ тыдзень», — адзначыў Уладзімір Гракун. Гэта аптымальныя агратэхнічныя тэрміны.

«Пасля завяршэння сяўбы ранніх яравых збожжавых і зернебабовых культур аграрыі пачнуць сеяць цукровыя буракі, лён, бульбу, — працягнуў намеснік міністра. — За выключэннем кукурузы сяўба тэхнічных культур павінна быць завершана да 1 мая. Кукурузу ж трэба пасеяць да 15 мая».

### ДЛЯ МАЛАКА ПАТРЭБНА СЕНА

Плошча пасеву шматгадовых траў будзе павялічана больш чым на 60%. «Гэта зробяць за кошт скарачэння пасеваў кукурузы, якімі мы ў апошні час зашмат займаліся, — сказаў Уладзімір Гракун. — Гэта не значыць, што мы зусім скароцім кукурузу. Яна патрэбна для атрымання корму — кукурузнага сіласу. Аднак і сянаж патрэбен, каб павялічваліся надоі. Тым больш што кукуруза, калі яе садзяць з года ў год, можа быць пашкоджана кукурузным матыльком, які трапіў да нас з Сербіі. Такое было ўжо летась. Сербы змагаюцца з гэтай праблемай праз севазварот — чаргаванне культур».

Запланавана давесці сяўбу шматгадовых траў да 1 млн 34 тыс. га. Сёння ў нас ёсць каля 800 тыс. га, гэта значыць, сёлета мы павінны пасеяць 540 тыс. га траў на раллі. «Асноўным павінен быць бобова-злакавы кампанент (каля 90%), і ў бабовых мы хацелі б мець 280 тыс. гектараў люцэрны», — сказаў намеснік міністра.

У цэлым, паводле звестак Мінсельгасхарча, на 13 красавіка шматгадовыя травы пасеяны на 208 тыс. га, у тым ліку бабовыя і бабова-злакавыя сумесі — на 173 тыс. га.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ,**
**фота аўтара**

■

### ДАРЭЧЫ

**У Беларусі вызначаны гранічныя максімальныя цэны на прадукцыю раслінаводства ўраджаю 2015 года, што закупляецца для дзяржаўных патрэб.**

**Цэны на асобныя віды сельгаспрадукцыі засталіся на ўзроўні мінулага года. Гаворка ідзе пра кошты на ячмень (у тым ліку піваварны), пшаніцу, грэчку, а таксама зерне кукурузы для вытворчасці крухмалу і крухмалапрадуктаў. Разам з тым цэны на фуражнае жыта, авёс, проса, насенне рапсу і цукровыя буракі выраслі ў параўнанні з мінулым годам. У прыватнасці, кошт 1 т жыта фуражнага вызначаны на ўзроўні 1 млн 43 тыс. рублёў (у 2014 — 931 тыс.), аўса (у залежнасці ад класа) — ад 1 млн 14 тыс. да 1 млн 344 тыс. (было ад 905 да 1 млн 200 тыс.). Кошт фуражнага аўса павялічваецца з 725 тыс. за 1 т да 812 тыс.**

**Цана 1 т проса (таксама ў залежнасці ад класа) складзе сёлета 1 млн 8 тыс. — 1 млн 375 тыс. (было 960 тыс. — 1 млн 310 тыс.), масланасення рапсу — 3 млн 521 тыс. — 3 млн 780 тыс. (супраць 3 млн 260 тыс. — 3 млн 500 тыс. у 2014 годзе). Кошт 1 т цукровых буракоў устаноўлены на ўзроўні 356-446 тыс. (некандыцыйных/кандыцыйных). Летась ён складаў адпаведна 321 тыс. і 402 тыс. за 1 т.**



■ Погляд

# РАЗАМ ЦІ ПААСОБКУ?

**На мінулым тыдні ў Варшаве была праведзена міжнародная канферэнцыя «Польшча і Беларусь у сучаснай Еўропе». Арганізатарамі выступілі пасольства Рэспублікі Беларусь у Польшчы, Інстытут еўрапеістыкі факультэта журналістыкі і палітычных навук Варшаўскага ўніверсітэта, БДУ і таварыства супрацоўніцтва «Польшча — Усход».**

Правядзенне канферэнцыі, несумненна, было ўдалай ідэяй. Польшча з'яўляецца трэцім па памеры насельніцтва і другім па магутнасці эканомікі суседам Беларусі. Як паказвае практыка, з трох суседзяў Беларусі — Літвы, Латвіі і Польшчы — менавіта Польшча ў найбольшай ступені ўплывае на фарміраванне палітыкі ЕС у дачыненні да нашай краіны. Між тым аж да мінулага года стан адносін з Польшчай цяжка было назваць нармальным, што адбівалася негатыўна і на нашых адносінах з Еўрасаюзам. Найбольшыя праблемы былі ў галіне палітычных адносін. Год 2014-ы, які прынёс вайну ў суседнюю і для Беларусі, і для Польшчы Украіну, паслужыў сігналам для Варшавы да пераасэнсавання сваёй палітыкі ў дачыненні да Мінска. Аднавіўся і актыўны пошук шляхоў дыялогу, што дазволіла правесці і гэтую знакавую для навуковай супольнасці канферэнцыю.

Адкрыў канферэнцыю прарэктар Варшаўскага ўніверсітэта Алойзы Новак. Вельмі пазітыўна ацаніўшы перспектывы яе правядзення, ён падкрэсліў значнасць беларускай эканомікі ў свеце, расказаўшы, у прыватнасці, што ў час яго знаходжання ў ЗША бачыў на палях вельмі шмат беларускіх трактароў. Станоўча прафесар Новак адгукнуўся і пра патэнцыял беларускіх студэнтаў, якія прыязджаюць для навучання ў Варшаўскі ўніверсітэт, асабліва адзначыўшы іх здольнасці ў сферы матэматыкі.

Пасол Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча Аляксандр Авяр'янаў вітаў адкрыццё канферэнцыі, зрабіўшы асаблівы акцэнт на тым, што людзі з'яўляюцца найбольш важным капіталам у развіцці беларуска-польскіх адносін. Аляксандр Авяр'янаў адзначыў, што сучаснае супрацоўніцтва дзвюх краін абапіраецца на шматвяковую гісторыю адносін, у рамках якой сфарміравалася шмат агульных традыцый і культурных асаблівасцяў. А адной з найбольш важных перспектыў у развіцці адносін стане магчымасць развіваць беларуска-польскія адносіны ў кантэксце новых інтэграцыйных фарматаў.

Прафесар Збігнеў Анташэўскі, прэзідэнт таварыства «Польшча — Беларусь», заклікаў да канкрэтных крокаў з боку Польшчы па вырашэнні набалелых праблем, што дазволіць палепшыць адносіны з Беларуссю. Сярод іх — адмова ад выкарыстання азначэння «крэсаў усходніх», паколькі яно не можа вітацца ў Беларусі. Цяжка, на яго думку, лічыць удалай ідэяй і супрацоўніцтва з неафіцыйным саюзам палякаў, у той час як афіцыйнаму саюзу ў супрацоўніцтве адмоўлена. Трэба прыняць і тое, што ў Беларусі не гатовы разглядаць удзельнікаў Арміі Краёвай у якасці ветэранаў антыфашысцкага супраціўлення, што цалкам зразумела: многія з іх ужо пасля вайны змагаліся з савецкай уладай.

Прафесар Ігар Марзалюк, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, звярнуў увагу прысутных на тыя праблемныя гістарычныя пытанні, якія трэба сумленна абмяркоўваць, каб палепшыць адносіны Польшчы і Беларусі. У іх ліку важна і тое, што цяперашняя пазіцыя нашай краіны звязана ў тым ліку і з тым, што ў перыяд паміж Першай і Другой сусветнай войнамі беларусы нічога добрага ад Польшчы не атрымалі. У выніку прыход савецкай арміі ў Заходнюю Беларусь у верасні 1939 года і аб'яднанне беларускіх зямель аднадушна віталі ўсе палітычныя сілы Заходняй Беларусі як гістарычную справядлівасць.

Сяргей Мусіенка, дырэктар аналітычнага цэнтра «ЭкооМ», акрэсліўшы асаблівасці беларуска-польскіх адносін на сучасным этапе, заклікаў да вылучэння сумесных ініцыятыў дзвюх краін, якія маглі б зрабіць Еўропу больш бяспечнай. Настаў час і для абмеркавання ўзаемных візітаў кіраўнікоў дзяржаў Беларусі і Польшчы.

Доктар Крыстаф Федаровіч, супрацоўнік Універсітэта Адама Міцкевіча ў Познані, адзначыў нізкую інфармаванасць польскага грамадства аб працэсах у Беларусі. Вылучаныя раней празмерныя патрабаванні да Беларусі з боку польскага ўрада трэба змякчаць з-за ўкраінскага крызісу, які аказвае негатыўны ўплыў і на Польшчу, і на Беларусь. У якасці спосабаў вырашэння праблем з нізкай інфармаванасцю аб сітуацыі ў Беларусі Крыстаф Федаровіч прапанаваў пазбаўляцца ад стэрэатыпаў, развіваць турызм, выкарыстоўваць магчымасці «Усходняга партнёрства» і інтэнсіфікаваць абмен студэнтамі.

Адбылося таксама яшчэ больш за дваццаць іншых выступленняў удзельнікаў канферэнцыі. У сваім дакладзе я падкрэсліў важнасць развіцця беларуска-польскіх адносін у кантэксце еўрапейскай і еўразійскай інтэграцыі. Дакладнае ўсведамленне нацыянальных інтарэсаў у рамках гэтых інтэграцыйных фарматаў дапаможа Беларусі і Польшчы набыць больш эканамічных выгад, чым было б магчыма атрымаць, дзейнічаючы не ўзгоднена.

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук**

■

■ Блізкая ўлада

# ДАШКОЛЬНЫЯ ЎСТАНОВЫ МІНСКА ЗАГРУЖАНЫ НА 122%

## А цягам двух гадоў у сталіцы плануюць пабудаваць 4 дзіцячыя садкі

**Пра гэта паведаміў намеснік старшыні Мінгарвыканкама Ігар КАРПЕНКА падчас прамой тэлефоннай лініі. Пры гэтым ён адзначыў, што гарадскія ўлады гатовы разгледзець любыя прапановы па стварэнні прыватных дашкольных устаноў, у тым ліку і сямейных дзіцячых садкоў.**



Фота БЕЛТА.

Праўда, па словах Ігара Карпенкі, вялікай колькасці падобных прапаноў пакуль не паступае — цяпер распрацоўваюцца толькі два такія звароты.

Між тым, гаворачы пра сямейныя дзіцячыя садкі, намеснік старшыні Мінгарвыканкама адзначыў, што яны не вырашаюць праблему забяспечанасці дзяцей дашкольнай адукацыяй. «Так, там можна пакінуць дзіця, але для яго навучання неабходны спецыялісты», — канстатаваў Ігар Карпенка.

Выхад з сітуацыі, на думку намесніка старшыні Мінгарвыканкама, бачыцца толькі ў будаўніцтве новых дашкольных устаноў.

«Летась адкрылі дзіцячы садок у мікрараёне Усход, на пачатку гэтага года — комплекс «дзіцячы сад — сярэдняя школа» ў Парку высокіх тэхналогій. У маі — чэрвені яшчэ адзін садок прыме малых у Каменнай Горцы», — распавёў спецыяліст.

Апроч дзіцячых садкоў, людзей хвалявалі пытанні аховы здароўя, выплаты заробкаў, пенсійных дапамог і адраснай матэрыяльнай дапамогі. А вось званкоў па тэме будаўніцтва жылля і жыллёва-камунальнай гаспадаркі ў гэты раз паступіла няшмат. На частку зваротаў тлумачэнні былі дадзены адразу ж па тэлефоне. Усяго падчас прамой лініі было прынята больш як 70 званкоў ад мінчан і жыхароў іншых рэгіёнаў Беларусі.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК**

■

# ЯБЛЫНЕВЫ САД ПЕРАМОГІ

## зацвіце на востраве Пагранічны Брэсцкай крэпасці

**Менавіта гэты востраў адчуў на сабе першы ўдар вайны. Сюды пасыпаліся бомбы і гарматныя снарады ў чатыры гадзіны раніцы 22 чэрвеня. Да нядаўняга часу востраў быў закрытай памежнай зонай. Таму можна сказаць, што на ім спыніўся час. Многія будынкі і іншыя аб'екты засталіся такімі, якімі яны выглядалі ў першыя дні вайны.**


Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Але і на востраў прыйшло жыццё. Два гады таму Пагранічны быў адкрыты для наведвання турыстычных груп, якія водзяць сюды пасля праходжання памежных фармальнасцяў. А цяпер яшчэ турысты ўбачаць і сад з маладых яблынь. Яго вырашылі пасадзіць па ініцыятыве супрацоўнікаў абласнога ўпраўлення ўнутраных спраў. Да акцыі далучыліся брэсцкія памежнікі, моладзь, грамадскасць, кіраўніцтва горада, запрасілі ветэранаў.

І роўна за месяц да юбілею Перамогі пасадзілі 70 саджанцаў яблынь у гонар важнай даты. Новы сад вырашылі назваць Садам цішыні. Пазней тут паставяць лаўкі, каб кожны ахвотны мог пасядзець, пачаставацца яблыкам і падумаць пра тое, якой цаной здабытая Перамога.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

■ Прамая лінія

# ВЕТЭРАНЫ, ЗВЯРТАЙЦЕСЯ!

З 15 красавіка па 15 мая ў Магілёўскай вобласці будзе працаваць прамая тэлефонная лінія для ветэранаў вайны і членаў іх сем'яў. Свае пытанні, заўвагі, скаргі можна будзе выказаць па тэлефонах Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Магілёўскага аблвыканкама (8-0222) 27-35-58 і 32-68-23. Працаваць яна будзе ў будныя дні з 8 да 17 гадзін з перапынкам з 13 да 14 гадзін.

Паводле слоў **старшыні камітэта Святланы ТАРАСЕНКІ**, жыхарам вобласці, якія пацярпелі ад вайны, сёння аказваецца рознабаковая дапамога. На медыцынскае абследаванне ветэранаў, рамонт печак, замену праводкі ў іх дамах і некаторыя іншыя паслугі ў абласным бюджэце запланавана больш 1,1 мільярда рублёў.

Матэрыяльную аднаразовую дапамогу ў памеры ад 3,5 да 8 мільёнаў рублёў да Дня Перамогі ў вобласці атрымаюць 5580 удзельнікаў вайны і пацярпелых ад яе. На гэтыя мэты прадугледжана каля 26 мільярдаў бюджэтных рублёў. Дарэчы, на 7 красавіка дапамога была выплачана ўжо больш як 97% ветэранаў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

■

■ На слыху

# Укладчыкам Дэльта Банка ўжо вяртаюць грошы

## А сам банк будуць банкруціць. Кампенсацыя юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам будзе ажыццяўляцца ў другой палове года



**«Аддзяленні ЗАТ «Дэльта Банк» праз адзін-два тыдні спыняюць прыём заяў ад укладчыкаў-фізічных асоб, — паведаміў выканаўца абавязкаў генеральнага дырэктара Агенцтва па гарантаванай кампенсацыі банкаўскіх укладаў фізічных асоб Аляксандр ПЯДЗЬКО. — Гэта будзе зроблена з мэтай скарачэння расходаў банка. Але пры гэтым супрацоўнікі банка будуць арыентаваныя на тое, каб абзваніваць укладчыкаў для паскарэння працэсу збору заяў». Укладчыкі, якія ўсё ж такі не паспеюць падаць заяву на кампенсацыю ў банку, змогуць на працягу двух гадоў з моманту адклікання ліцэнзіі зрабіць гэта ў агенцтве. Цяпер тут займаюцца апрацоўкай заяў, якія ўжо паступілі.**

### ШТОДЗЕНЬ ПА 300-400 ЗАЯЎ

У агенцтве абслужылі больш за 6,5 тысячы заяў, што ў сумарным выражэнні складае больш за 82% ад усіх магчымых заяў фізічных асоб. «Працэс прыняцця заяў наладжаны, адпрацаваны. Сітуацыя развіваецца кантралявана», — адзначыў Аляксандр Пядзько. Паводле яго слоў, 7 красавіка агенцтва пералічыла Банку «Масква-Мінск» сродкі, неабходныя для выплаты кампенсацыі, — каля 1,2 трлн беларускіх рублёў у эквіваленце.

Кіраўнік агенцтва распавёў, што колькасць заяў, якія паступаюць ад укладчыкаў непасрэдна ў агенцтва, скарачаецца. Калі ў першыя дні прыходзілі па 300-450 укладчыкаў, то цяпер не бывае і 30. Невялікая колькасць незадаволеных укладчыкаў напісалі заявы на ўдакладненне звестак аб сумах, якія ім павінны быць вернутыя. Такіх зваротаў, паводле слоў Аляксандра Пядзько, нешматт, каля двух дзясяткаў. На працягу тыдня ў агенцтве маюць намер разабрацца і з гэтымі пытаннямі.

### ВЫПЛАТЫ ПАЧАЛІСЯ МЕНЕЙ ЧЫМ ПРАЗ МЕСЯЦ

«Дэбют агенцтва і банка-паверанага, на мой погляд, прайшоў выдатна», — заявіў **намеснік старшыні праўлення Банка «Масква-Мінск» Аляксандр ВАЛАДЗЬКО**. Агенцтва па гарантаванай кампенсацыі банкаўскіх укладаў фізічных асоб упершыню з моманту стварэння выконвае сваю функцыю. А Банк «Масква-Мінск» — гэта першы банк-паверана, які дзейнічае ад імя агенцтва і за яго кошт у частцы выплат кампенсацыі ўкладчыкам. Тым не менш працу ўдалося арганізаваць такім чынам, што ад даты адклікання ліцэнзіі да дня пачатку выплаты грошай прайшло менш за месяц. «Лічу, гэты факт гаворыць сам за сябе. Механізм працуе. Усё, што вызначана заканадаўствам, будзе выканана ў тэрміны і цалкам — банкам і агенцтвам», — адзначыў Аляксандр Валадзько.



Так, грошы ўкладчыкам-фізічным асобам ЗАТ «Дэльта Банк» пачалі вяртаць 13 сакавіка. Атрымаць кампенсацыю можна ў 21-м аддзяленні Банка «Масква-Мінск». «Улічваючы паток укладчыкаў, мы павялічылі рэжым працоўнага часу — хутчэй за ўсё, будзем працаваць дадаткова ў суботу і ў адзін перадсвяточны дзень», — праінфармаваў намеснік старшыні праўлення.

«Па тых тэмпах, якімі агенцтва апрацоўвае заяўкі і перадае іх у банк, лічу, што за першыя два-тры тыдні мы зможам задаволіць патрабаванні ўкладчыкаў у аб'ёме каля дзвюх трацін ад агульнай колькасці грашовых сродкаў», — сказаў Аляксандр Валадзько.

### КРЭДЫТЫ З ТЫМІ Ж НУМАРАМІ

Частка крэдытнага партфеля ЗАТ «Дэльта Банк» была перададзена Банку «Масква-Мінск». «Мы зрабілі гэта максімальна зручным для крэдытаатрымальнікаў, захавалі ўсе ўмовы, якія ў іх былі ў Дэльта Банку, аж да нумара крэдытнага дагавора, каналаў і тэрмінаў пагашэння», — падкрэсліў прадстаўнік Банка «Масква-Мінск». Пры своечасовым выкананні абавязацельстваў ніякіх праблем не будзе. Калі ў некага быў і крэдыт, і дэпазіт, то гэта ўлічваецца пры кампенсацыі ўкладу.

### НА ШЛЯХУ ДА БАНКРУЦТВА

Тым часам рыхтуецца заява ў суд аб прызнанні ЗАТ "Дэльта Банк" банкрутам. Пасля прыняцця адпаведнага рашэння будуць выконвацца ўсе прадугледжаныя заканадаўствам працэсуальныя дзеянні. У прыватнасці, гаворка ідзе пра фарміраванне рэестра патрабаванняў крэдытораў, правядзенне іх сходу, зацвярджэнне плана ліквідацыі.

«Зыходзячы з тых працэсуальных тэрмінаў, якія прадугледжаны заканадаўствам, рэальна пакрыццё юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам будзе ажыццяўляцца ў другой палове года», — праінфармаваў Аляксандр Пядзько. Ён дадаў, што абавязацельствы перад юрыдычнымі асобамі будуць выконвацца за кошт маёмасці ЗАТ «Дэльта Банк».

### ХОПІЦЬ УСІМ

Кіраўніцтва Банка «Масква-Мінск» просіць не ствараць ажыятажу і не хвалявацца наконт таго, што некаму не хопіць грошай. Грошай столькі, колькі банк узяў абавязацельстваў. «Запісы на некаторыя аддзяленні зашкальваюць — па 170-180 чалавек у дзень. Мы з гэтым справімся, але нам могуць перашкаджаць тыя, хто будзе жадаць атрымаць грошы раней за адведзеную ім дату. Не хвалюйцеся, хопіць усім. Грашовых сродкаў роўна столькі, колькі абавязацельстваў узяў на сябе Дэльта Банк», — сцвярджае Аляксандр Валадзько.

Каб пераканаць, што грошы насамрэч ёсць, прадстаўнік банка растлумачыў, адкуль яны ўзяліся: «Кожны банк, які мае ліцэнзію Нацыянальнага банка на прыцягненне ўкладаў насельніцтва, абавязкова становіцца на ўлік у Агенцтва. Ён плаціць уступны ўзнос — 0,5% ад нарматыўнага капіталу, і далей плаціць рэгулярныя штоквартальныя ўзносы — 0,1% ад прыцягнутых сродкаў. І калі адбываецца падобнае, у агенцтве ўжо створаны рэзерв».

Дарэчы, спрачацца з банкам наконт сумы кампенсацыі не мае сэнсу, бо агенцтва вызначае сумы. Гэта трэба вырашаць у момант звароту ў Агенцтва па гарантаванай кампенсацыі ўкладаў.

***

Нагадаем, што з 12 сакавіка ў ЗАТ «Дэльта Банк» рашэннем праўлення Нацыянальнага банка была ўведзена часовая адміністрацыя па кіраванні банкам. З 18 сакавіка Нацбанкам адклікана ліцэнзія ЗАТ «Дэльта Банка» на ажыццяўленне банкаўскай дзейнасці.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ, фота аўтара.**





### Алгарытм атрымання грошай

Укладчык можа атрымаць грошы двума спосабамі. Першы — асабіста звярнуцца ў Агенцтва па гарантаванай кампенсацыі ўкладаў. Грамадзяніна запісваюць на канкрэтную дату прыёму, калі ён прыходзіць у офіс і атрымлівае на рукі «апавяшчэнне», дзе пазначана імя, прозвішча і імя па бацьку чалавека і яго пашпартныя звесткі, а таксама тыя сумы (у адпаведных валютах), якія ён можа запатрабаваць да вяртання. У «апавяшчэнні» таксама ёсць канкрэтная дата, пачынаючы з якой ён можа звярнуцца ў Банк «Масква-Мінск». Пазначаны і адрас аддзялення, якое выбірае сам укладчык, каб яму было зручна. З гэтай даты яго чакаюць у офісе Банка «Масква-Мінск» з «апавяшчэннем» і пашпартам.

Другі спосаб падыходзіць для тых, хто жыве не ў сталіцы. Такі чалавек павінен звярнуцца ў бліжэйшае аддзяленне «Дэльта Банка» і з дапамогай яго супрацоўнікаў запоўніць пісьмовую заяву ў агенцтва. Заява аддаецца ў агенцтва і апрацоўваецца. «Апавяшчэнне» аддаецца адразу ў Банк «Масква-Мінск». Там яно апрацоўваецца, пасля чаго чалавека інфармуюць па тэлефоне прад дзень, з якога яго чакаюць у любым зручным аддзяленні Банка «Масква-Мінск».

■ Ну і ну!

# Арудаваў падпальшчык аўто

**За адну ноч у Першамайскім раёне сталіцы згарэлі тры аўтамабілі. Абставіны здарэння і характар пажараў дазваляюць меркаваць, што гэта былі падпалы. Вінаватага ўжо шукаюць следчыя органы.**


Фота onliner.by

Напачатку відавочцы паведамілі, што гарыць аўтамабіль на вуліцы Уручскай. Калі падраздзяленні МНС прыбылі на месца, легкавік «Дэу» быў ужо цалкам ахоплены полымем. Выратавальнікі за лічаныя хвіліны ўтаймавалі агонь, але вярнуцца ў падраздзяленне не паспелі. На нумар «101» зноў паступіў званок пра пажар аўто непадалёку. На гэты раз на вуліцы Астрашыцкай гарэў «Форд Сіера». Як толькі быў лакалізаваны і другі пажар, даваліся на гэтай жа вуліцы тушыць ужо «Рэно 19».

На момант прыбыцця падраздзяленняў МНС усе тры аўтамабілі былі цалкам ахоплены агнём, таму, нягледзячы на хуткасць, з якой выратавальнікі аказваліся на месцы здарэнняў, транспартныя сродкі былі пашкоджаны цалкам. Пацярпелых, на шчасце, не было.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■


Открытое акционерное общество

**«Дорожно-строительный трест № 3»**

**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ,**

**которое состоится 24 апреля 2015 года в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

**1. Об открытии филиала Общества.**

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться 24.04.2015 г. с 10.00 до 10.45 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании – 15.04.2015 г.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, можно ознакомиться с материалами к собранию по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 33.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, при себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров – доверенности, зарегистрированные в соответствии с действующим законодательством).

Справки по телефонам: 28-40-20, 23-64-87 – Отдел правовой и кадровой работы, Наблюдательный совет.

УНП 700049607

■ Славутыя земляки

# Цвёрдая глеба Гаўрылы Гарэцкага


Гаўрыла і Максім Гарэцкія. 1926 год.

**МУСІЦЬ, няма ніводнага кутка пявучай беларускай зямлі, які не меў бы сваіх выдатных пісьменнікаў, таленавітых мастакоў слова, вучоных. Зямля Магілёўшчыны ўзгадавала для слаўнай, але нялёгкай долі братоў Гарэцкіх: беларускага пісьменніка Максіма Гарэцкага і беларускага вучонага — эканаміста, геолага, географа, дзяржаўнага дзеяча, акадэміка ў галіне дзвюх навук (эканамічнай і геалогіі) — Гаўрылу Гарэцкага.**

Нарадзіўся Гаўрыла Іванавіч Гарэцкі 10 красавіка 1900 года ў вёсцы Малая Багацькаўка былой Шамаўскай воласці, што знаходзіцца ў паўночным кутку Мсціслаўшчыны. Яго бацькі, Ефрасіння Міхайлаўна і Іван Кузьміч, лічылі, што іх дзеці павінны быць адукаванымі людзьмі.

Пасля заканчэння двухкласнага земскага вучылішча паступіў у Горацкае каморніцка-агранамічнае вучылішча, якое закончыў з выдатнымі адзнакамі. Падчас вучобы ён пачаў займацца апрацоўкай кніг па сельскай гаспадарцы для сялян на беларускай мове, складаннем беларускай тэрміналогіі, бо многія вучні і настаўнікі непрыхільна ставіліся да роднай мовы. Разам з братам Максімам Гарэцкім у 1918 годзе ён апублікаваў першы руска-беларускі слоўнік, які вытрымаў два выданні, а потым шэраг работ па мовазнаўстве, фальклоры, этнаграфіі.

Цяга да ведаў, жаданне атрымаць вышэйшую адукацыю прывялі Гаўрылу Іванавіча ў Пятроўскую (Ціміразеўскую) сельскагаспадарчую акадэмію на эканамічны факультэт. Вучыўся добра, займаўся навуковай дзейнасцю, удзельнічаў у экспедыцыях. Ён збіраў матэрыял для сваёй працы «Бюджэтны аналіз сялянскай гаспадаркі». Максім Гарэцкі ў «Камароўскай хроніцы» піша пра гэты перыяд жыцця брата: «Праца на Меншчыне ўзбагаціла яго жыццёва, агранамічную і беларускую дасведчанасць... Балотная Беларусь паўстала яму ўвачу жывою... Там яны рэальна ўбачылі, якое знішчэнне рабілі палякі нашаму краю: польская салдатня нішчыла жывёлу часам 50% ад усяго статку. Людзі тут толькі яшчэ пачыналі лічыць сябе беларусамі... Ён бачыў тут вельмі цікавы быт, меў перад вачыма багаты этнаграфічны матэрыял. Запісаў 20 песень (у тым ліку былі гістарычныя), 100 прыказак. Гаманіў доўга з сялянамі. Часамі жудасна рабілася яму, што яшчэ доўгі час пройдзе, пакуль Беларусь будзе сапраўды Даніяй...»

Па дарозе назад з экспедыцыі заехаў Гаўрыла ў Малую Багацькаўку і забраў з сабою малодшую сястру Ганну, якая хацела паступіць у Пятроўскую акадэмію. Задумаў у маладых людзей было вельмі шмат... Але планы і мары не здзейсніліся. У верасні 1922 года Гарэцкага абвінавацілі ў контррэвалюцыі і павінны былі выслаць у Германію. Уся яго дзейнасць па арганізацыі беларускіх студэнцкіх асацыяцый, часопіса «Маладая Беларусь» і іншая праца была абмалявана як шавінізм і контррэвалюцыя. Яго адвезлі на Лубянку і размясцілі там у асобнай камеры. Сястра Ганна вельмі перажывала за брата, насіла яму ў турму перадачы. Калі яна чарговы раз ехала да яго на трамваі, хтосьці штурхнуў яе, і дзяўчына, трапіўшы пад колы, загінула. Гору Гарэцкага не было канца. Ён адчуваў сябе вінаватым у яе смерці. Гэты дзень застаўся самым цяжкім, самым самотным у яго жыцці. Ён не быў тады высланы за мяжу. Невядома, што выратавала: ці то смерць сястры, ці добрыя водгукі з акадэміі. Арышт моцна параніў рамантычную душу Гаўрылы: ён убачыў і глыбока адчуў, што жыццё часта бывае несправядлівым. Але яшчэ з большым натхненнем і ўпартасцю ўзяўся за вучобу, за набыццё ведаў, бо разумеў, што толькі новая адукаваная і культурная інтэлігенцыя зможа пабудаваць моцную Беларусь.

**Пачаў займацца апрацоўкай кніг па сельскай гаспадарцы для сялян на беларускай мове, складаннем беларускай тэрміналогіі, бо многія вучні і настаўнікі непрыхільна ставіліся да роднай мовы.**

Гаўрыла Іванавіч ганарыўся званнем студэнта-пятроўца, бо гэта была адна з найлепшых навучальных устаноў. Цікавыя лекцыі дапаўняліся актыўным удзелам у так званых гуртках грамадскай агранаміі, што павінны былі праводзіць тэарэтычныя веды ў практыку сельскай гаспадаркі і карыстаціся тады вялікай папулярнасцю. Нярэдка ладзіліся розныя сельскагаспадарчыя выставы, у якіх удзельнічаў і Гарэцкі. Тут ён пазнаёміўся са сваёй будучай жонкай Ларысай Парфяновіч. 8 ліпеня 1923 года яны пажаніліся.

У ліпені 1924 года Гаўрыла скончыў Ціміразеўскую акадэмію і быў пакінуты дзеля навуковай працы ў аспірантуры. Ён упарта працаваў над эканамічнай геаграфіяй Беларусі. Выйшла з друку яго вялікая манаграфія «Народны прыбытак Беларусі». У пачатку 1927 года паўстала пытанне аб стварэнні ў Мінску Беларускага навукова-даследчага інстытута сельскай і лясной гаспадаркі. Дырэктарам новага інстытута быў абраны Гаўрыла Іванавіч.

1 студзеня 1929 года Гарэцкі стаў акадэмікам, прычым самым маладым за ўсю гісторыю беларускай навукі. Але не ўсім падабаўся мэтанакіраваны, сумленны малады вучоны. 24 ліпеня 1931 года яго арыштоўваюць. На гэты раз за шпіянаж. 19 жніўня 1931 года ўсіх, у каго была вышэйшая адукацыя, адправілі ў Мядзведжую Гару на будаўніцтва Беламорска-Балтыйскага камбіната. Спачатку Гарэцкі працаваў у картаважнай майстэрні, рабіў так заўзята, што ў канцы верасня яго перавялі навукова-тэхнічным супрацоўнікам Геалбазы, а яшчэ праз паўгода — старшым інжынерам-геолагам. У кастрычніку 1934 года Гарэцкі быў вызвалены за добрую працу. Яго адпусцілі на зусім кароткі час з'ездзіць да бацькоў у Малую Багацькаўку і забраць сям'ю, але раілі застацца працаваць на ББК.

Пачалася Вялікая Айчынная вайна. Гаўрылу Іванавіча мабілізавалі на абарончыя работы. Яго прызначылі галоўным геолагам ва Упраўленне ваенна-палявога будаўніцтва Наркамата абароны. Рабіў розныя даследаванні па ваеннай геалогіі: вышукванні пад будаўніцтва абарончых збудаванняў, ацэнку праходнасці войскамі тэрыторый, пошукі пітной вады і іншае. За гэтую работу адразу пасля вайны Гарэцкі быў узнагароджаны медалямі: «За ўдзел у гераічнай абароне Масквы», «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гадоў».

У 1946 годзе Гарэцкі абараніў дысертацыю на суісканне вучонай ступені доктара геолага-мінералагічных навук.

Жыццё паступова наладжвалася. У 1959 годзе рэабілітавалі брата — Максіма Гарэцкага. Патроху пачалі атрымліваць рэабілітацыю і творы пісьменніка, якія вярталіся да чытачоў. Кожная публікацыя была радасцю для Гаўрылы Іванавіча. Ён выступаў з успамінамі пра брата на ўрачыстых вечарах, прысвечаных юбілеям пісьменніка, друкаваў успаміны пра Максіма, напісаў шэраг артыкулаў з успамінамі пра Купалу, Коласа, Крапіву, Дубоўку.

**Ён убачыў і глыбока адчуў, што жыццё часта бывае несправядлівым. Але яшчэ з большым натхненнем і ўпартасцю ўзяўся за вучобу, за набыццё ведаў, бо разумеў, што толькі новая адукаваная і культурная інтэлігенцыя зможа пабудаваць моцную Беларусь.**

У 1968 годзе Гаўрыла Гарэцкі змог вярнуцца ў Мінск. На Бацькаўшчыне апошнія дваццаць гадоў жыцця для яго былі сапраўдным падарункам лёсу, самым шчаслівым часам, калі мары здзейсніліся. Нягледзячы на досыць сталы ўзрост, ён працаваў вельмі многа. У яго адкрылася «другое дыханне», ён памаладзеў і не адчуваў стомы. Яго цікавіла ўсё, што мела дачыненне да Беларусі: развіццё навукі і вучоныя, тэатр і філармонія, выступленні пісьменнікаў і музеі, мова і літаратура, беларускамоўныя часопісы і газеты (выпісваў амаль усе), фальклор і этнаграфія, эканоміка і народная гаспадарка, жыццё вёскі і горада, прырода... З часам пабачылі свет шэраг яго артыкулаў, тэзісаў, дакладаў на розных канферэнцыях і кангрэсах. Атрымала шырокую вядомасць створаная Гарэцкім моцная беларуская школа геолагаў — чацвярцічнікаў.

Гаўрыла Іванавіч пражыў напружанае, поўнае творчай актыўнасці жыццё і памёр 20 лістапада 1988 года ў Мінску. Даўгавечным помнікам Гарэцкаму будзе музей валуноў над адкрытым небам, створаны па яго ініцыятыве пры Інстытуце геалогіі і геафізікі АН БССР на плошчы каля 6 гектараў. Тут размешчана больш за дзве тысячы ледавіковых валуноў, звезеных з усёй краіны і раскладзеных на стылізаванай карце Беларусі, якую ўяўляе сабой музей.

Лідзія БАРАЗНА

■

БАЙКІ кухмістра ВЕРАШЧАКІ

# КАПЛУНЫ І КАНЦЭПТЫ

**У шляхецкай культуры барока публічнае застолле — з нагоды сейміка, вяселля, візіту каранаванай асобы — было самым сапраўдным спектаклем. А кухмістр — рэжысёрам. Смакавыя вартасці страў адыходзілі на другі план падобна да таго, як сёння ў музычных шоу уласна музыка другасная ў дачыненні да відовішча.**

Некалькі такіх «канцэптаў», або «кухарскіх сакрэтаў», выкладзены ў славутай кулінарнай кнізе кухмістра Станіслава Чарнецкага Compendium Ferculorum («Збор страў»), якая выйшла ў Кракаве ў 1682 годзе і лічыцца эталонным выкладам густаў магнатаў «сармацкай» эпохі. Чарнецкі праславіўся сваім майстэрствам задоўга да выхаду гэтай кнігі. Напрыклад, ён у 1661 годзе кіраваў падрыхтоўкай стала да вяселля дачкі Ежы Любамірскага. На ім было з'едзена 60 валоў, 5000 каплуноў, 8000 курэй, 13 000 рыб розных відаў і больш за 18 000 яек. А найлепшага вугорскага віна было выпіта 270 бочак. І такіх бясед у «рэжысёрскай» кар'еры кухмістра Чарнецкага было мноства. За сваё кулінарныя дасягненні — даволі рэдкая рэч у саслоўнай іерархіі Рэчы Паспалітай — ён у 1676 годзе быў уведзены ў шляхецкае саслоўе.

Дык вось, найпершы «кухарскі сакрэт», які Чарнецкі рэкамендаваў дзівіць гасцей, была суцэльная рыба (як правіла, шчупак), прыгатаваная, ад галавы да хваста, трыма рознымі спосабамі. У паэтычным выкладзе Адама Міцкевіча ў паэме «Пан Тадэвуш» гэта выглядала так:

*... Сакрэт кухарскі: рыбіна старанна*
*З канца падсмажана, а далей запякана,*
*А пры хвасце, як заліўная, згатавана.*

Вядома, такая страва патрабавала непаспалітых майстэрства і канцэнтрацыі кухара. Але не меней загадкава і інтрыгавальна выглядаў другі сакрэт кухмістра Чарнецкага: фаршыраваны каплун, змешчаны ў вялікую бутэльку. Чымсьці ён нагадваў вядомы марскі сувенір — сабраную ў празрыстай ёмістасці пінцэтам мадэль карабля. Каб з'есці каплуна, трэба было разбіць бутэльку. Але ўзнікала пытанне: як жа ён туды трапіў? Разгадка фокуса досыць простая: з варанага каплуна акуратна здымалі скуру, як панчоху, і змяшчалі ў пасудзіну, асцярожна разгарнуўшы, а потым праз трубачку напаўнялі абалонку фаршам.

Каплун (спакладаны певень) быў упадабаным аб'ектам гэтых тэатралізаваных кулінарных эксперыментаў. І ўвогуле адным з самых улюбёных інгрэдыентаў польска-літоўскай кухні эпохі барока. У рукапіснай кнізе невядомага кухмістра Радзівілаў канца XVII стагоддзя, знойдзенай некалькі гадоў таму ў польскіх архівах, сустракаецца 17 рэцэптаў страў з каплуна. Адным з самых жорсткіх «канцэптаў», можа быць, нават ніколі не рэалізаваным на практыцы, быў рэцэпт жывога запечанага каплуна! Магчыма, ён існаваў толькі ва ўяўленні аўтараў кулінарных кніг як пэўная хвараватая фантазія.

Частым матывам «канцэптаў» было такое прыгатаванне зыходных інгрэдыентаў стравы, што ў выніку яны пачыналі нагадваць нешта абсалютна іншае. Напрыклад, з салёнай рыбы лічылася шыкам прыгатаваць... фальшывых курапатак. Гэтая барочная мода была пастаўленая пад сумнеў толькі ў самым канцы існавання Рэчы Паспалітай, у часы караля Станіслава Панятоўскага і яго вернага кухмістра Паўла Трэмо. Тады пад уплывам новай французскай моды пачалі цаніць натуральны смак прадуктаў, адмовіліся ад празмернага ўжывання спецый, воцату і тады ж пачала занепадаць папулярнасць «канцэптаў». І каплуноў, дарэчы, таксама.

Дзіўная рэч, што слова «каплун» трапіла і ў беларускую сялянскую кухню, хаця, безумоўна, ні пра якую гадоўлю каплуноў у сялянскай гаспадарцы не магло быць размовы. На заходнім Палессі даўней былі вядомы ажно 2 цалкам адрозныя варыянты «каплуна». Першы ўяўляў з сябе не што іншае, як... хлеб з вадой. У гатаваную ваду (часам у кіпень) крышылі цыбулю, хлеб, дабаўлялі соль, запраўлялі алеем або салам. Елі «каплуна» з бульбай. У іншым варыянце бралі сушаных уюноў, ламалі (!) на кавалкі і залівалі гарачай вадой, у якой варылася бульба. Шчодра дабаўлялі кроп, зялёную цыбулю і, увогуле, усё першае зяленіва з агарода, дасальвалі і елі, калі страва цалкам астыне. Хутчэй за ўсё, абодва «каплуны» — гэта іронія, кпіна з колішняй вытанчанасці шляхецкіх застолляў, а таксама з уласнай беднасці. Але ў такім імкненні дасягнуць з зыходных інгрэдыентаў абсалютна нечаканага выніку ёсць нешта і ад сармацкіх «канцэптаў».


Што так прыцягвае ўвагу? Шчупак, прыгатаваны ад галавы да хваста трыма рознымі спосабамі, ці прыгожая дзяўчына?

■ У госці да чытача

# ЗЕНІТ. ВІЛЕЙКА. ЧЭМПІЁН!

**Шлях да школы №3 горада Вілейкі аказаўся досыць займальным. Зрэшты, як і любая іншая дарога, у якую ты выпраўляешся, каб убачыць новыя мясціны і здабыць на сваю галаву якіх-небудзь прыгодаў.**

На чыгуначным прыпынку мне сустрэўся мужчына, які апантана карміў вакзальнага ката. Спачатку даў яму паўпакета смятаны. А потым накрышыў хлеба і нарэзаў пару скрылёчкаў сала. Калі вусаты не надта спяшаўся есці новы ласунак, ён прыгаворваў: «Не, не галодны ты, Васька, зусім не галодны». Варта мне было запытацца, куды ісці, як мужчына адразу «запісаўся» ў мае праважатыя і суразмоўцы.

Чыгуначны прыпынак, на якім я выйшла, называўся «Зеніт». Аказваецца, менавіта тут размяшчаўся легендарны завод, на якім у савецкі час выраблялі вядомыя аднайменныя фотаапараты. У 1970-х з'явіліся першыя дамы для супрацоўнікаў завода. З часам яны запоўнілі ўсю ваколіцу.

Чым яшчэ адметны мікрараён, дык гэта соснамі. Жылыя дамы і сцяжынкі проста патанаюць у вялікай колькасці хваёвых. І гэта не можа не прываблівць: ад наваколля ідзе спакой, высокія дрэвы закалыхваюць сваёй магутнай велічнасцю. Расліны паглынаюць і лішнія гукі, ці іх тут папросту няма. Ідзеш — і цішыня здзіўляе, прыемна ўражвае...

Адметная і гісторыя з'яўлення самога чыгуначнага прыпынку «Зеніт». Яе мне распавёў мой праважаты. На гэтай ускраіне горада калісьці электрычкам спыняцца было забаронена. Бо побач размяшчаліся некаторыя стратэгічна важныя аб'екты, якім электрычныя разрады, што ідуць праз правады цягнікоў, былі перашкаджалі. Таму ля «Зеніта» электрычка не спынялася, ішла ў цэнтр, а адтуль шматлікім гараджанам даводзілася самастойна вяртацца назад. Вілейчукі, вядомыя ўсім сваім актыўным норавам, з такой сітуацыяй мірыцца не хацелі. Як толькі цягнік набліжаўся да іх раёна, яны зрывалі стоп-кран. Сцэнарый паўтараўся зноў і зноў. Машыністы, ведаючы такі расклад падзей, пачалі нават запавольваць ходу цягніка, а пасля таго, як хтосьці зрываў стоп-кран (у іншым выпадку спыніцца яны не мелі права), рабілі «незапланаваны» прыпынак. Дзякуючы вось такой напалітыкавалі жыхароў Вілейкі з'явіўся чыгуначны прыпынак «Зеніт» (ніякім стратэгічным аб'ектам ён ужо чамусьці не перашкаджаў).

Мой суразмоўца, які вёз з сабой скрыню з саджанцамі, аказаўся надзіва абазнаным у мясцовай ваеннай справе. Калісьці ён марыў стаць лётчыкам-выпрабавальнікам, але развал Савецкага Саюза паўным чынам паўплываў і на развал яго мары. «А вось паглядзіце яшчэ на наша Вілейскае мора!..» — задумена і ў захапленні сказаў ён. Мелася на ўвазе, зразумела ж, Вілейскае вадасховішча. Яго вялізная паверхня выкарыстоўваецца для таго, каб лятальныя апараты з космасу маглі ў ім адлюстроўвацца...

Варта прыгадаць таксама прыпынак «Чырвоны Беражок», праз які электрычка Маладзечна-Круляўшчызна ішла да «Зеніта». Я шмат чула пра гэтыя мясціны, выгадныя для летняга адпачынку. Але на гэты раз на свае вочы ўбачыла маляўнічую паўнаводную Вілію. Зграбнай стужкай яна ўецца паміж берагоў, чыстых ад буралому і смецця. Я вырашыла, што летам абавязкова вярнуся да ракі ў Чырвоным Беражку, да цiхмянага сасновага Зеніта.

Крочыла паўз пералесак, двары, дамы і нарэшце трапіла ў вілейскую школу №3. Кажуць, гэта адна з найлепшых школ горада. І, нягледзячы на тое, што знаходзіцца яна ў прыватным сектары, вучыцца ў ёй ажно 700 дзяцей — многія спецыяльна ездзяць сюды з цэнтра. Мяне сустрэў дырэктар Мікалай Гіро. Ён — настаўнік беларускай мовы і літаратуры, гутарыў са мной на прыгожай, чыстай мове. Дырэктар сказаў, што, каб у побыце размаўляў іначай, дзецям гэта не надта б спадабалася.

У гэтай школе чытаюць і любяць «Звязду», сочаць за многімі рубрыкамі, самі актыўна ўдзельнічаюць у розных конкурсах. Увогуле ж, установа адукацыі вядомая сваёй пазакласнай работай. Розныя пакаленні дзяцей «засвечваюцца» як удзельнікі і пераможцы шматлікіх акцый, праектаў, спаборніцтваў. Тут відавочная традыцыя якаснага выхавання і карыснага баўлення часу пасля ўрокаў. Яны, як надзейны фундамент, даюць вучням добры старт для іх узлётаў.

**«А вось паглядзіце яшчэ на наша Вілейскае мора!..» — задумена і ў захапленні сказаў ён.**

Зусім нядаўна навучэнцы школы сталі пераможцамі конкурсу на найлепшы слоган-дэвіз XIII рэспубліканскага экалагічнага форуму (пра гэта пісалі ў «Юным натуралісце», дадатку да часопіса «Родная прырода»). Дзеці змогуць стаць удзельнікамі гэтага мерапрыемства, верагодна, расказаць пра тыя прыродаахоўныя акцыі, якія ў іх пастаянна адбываюцца. А наперадзе — завяршэнне яшчэ аднаго праекта. Да 9 Мая тут плануюць адкрыць абноўлены музей баявой славы, пра што распавяла настаўніца гісторыі Алена Дубовік. Уражвае тое, што дзеці і бацькі, настаўнікі і дырэктар рамантуюць музей сваімі сіламі. Для таго, каб сабраць грошы на гэтую справу, яны штомесяц здаюць па тоне макулатуры, актыўна збіраюць металалом. А на прысядзібным участку школы самі вырошчваюць расаду кветак, якія ўсяго праз пару месяцаў аздобяць іх тэрыторыю... Падаецца, гэта надзвычай каштоўна, калі цябе з маленства вучаць быць актыўным. Калі жыццё не абмяжоўваецца званкамі з урока і на ўрок, прыходам на працу і сыходам з яе. Найбольш цікавы свет з'яўляецца тады, калі мы самі ствараем яго вакол сябе.

Тую ж захопленасць сваёй справай можна бачыць і ў іншых сферах жыцця Вілейкі. Школу №3 калісьці скончыў краязнавец, архітэктар Анатоль Капцюг. А сёння вакол яго, і не толькі, гуртуецца апантаная суполка аматараў краязнаўства і гісторыі. Аддзяленне Добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры ў гэтым горадзе надзвычай моцнае. Шматлікія вандроўкі, актыўныя даследаванні свайго краю, уласныя знаходкі і гіпотэзы — не многія гарады могуць такім пахваліцца. А яшчэ яны выдаюць гісторыка-краязнаўчы часопіс «Волат».

...Напрыканцы дня я сядзела на лаўцы ў вілейскім двары і грэлася на красавіцкім сонцы. Побач у пад'ездзе аказаўся незачыненым падвал. Месцічы, што ішлі міма, проста не маглі пакінуць такое без увагі. «А хто там? А чаму не зачынены?» — запытваліся яны ў мяне, падазрона гледзячы, як на незнаёмага чалавека, што можа ўчыніць беспарадкі на іх тэрыторыі. Мне падалося, што адзін дзядуля, з кійком, нават сачыў за мной, схаваўшыся за вугал дома, у арцы. Відаць, хацеў злавіць «на гарачым» і высветліць, навошта я адчыніла падвал. Такая пільнасць мне спадабалася. Гараджанам не ўсё адно, што адбываецца вакол. Яны клапоцяцца пра сваю зямлю і свой горад.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

*г. Вілейка*

■

ПРАКАВЕТНАЕ

*Хрыстос Уваскрос!*
*Валачобныя людзі добрыя,*
*Валачыліся, прамачыліся,*
*Хрыстос Уваскрос!..*



# ЗАКАЛЬНЕЦКІ ЖАЧЫК



Так спяваюць валачобнікі, уваходзячы ў гаспадарскі двор. У вёсцы Закальное Любанскага раёна на Велікодныя святы сапраўды, як у ранейшыя часы, ходзяць валачобнікі. Гэтая традыцыя, закладзеная яшчэ продкамі закальненцаў, захавалася да нашых дзён. А называецца гэты абрад па-мясцоваму — «Жачык». Тут дарослыя валачобнікі водзяць з сабою маленькага хлопчыка, якога называюць жачыкам. За апошні час валачобны звычай памяняўся: разам з дарослымі ходзяць і дзеці, каб пераймаць традыцыю. Але абрад называецца па-ранейшаму, і словы ў ім захаваліся:

*Я маленькі жачыку,*
*Паўзу, як рачыку,*
*Скачу, як жабка,*
*Дай яйка, бабка!*



У сённяшніх закальнецкіх валачобнікаў галоўная мэта — павіншаваць вяскоўцаў з вялікім святам і нагадаць ім пра цудоўную старажытную традыцыю, каб не забываліся на яе, перадавалі сваім дзецям і ўнукам. У пасялішчах непаўторныя мясцовыя традыцыі і абрады сышлі ў нябыт, а работнікі Дома культуры вёскі Закальное і дырэктар Надзея Мірэйчык падтрымліваюць свае адметныя звычаі на належным узроўні. Вяскоўцы чакаюць Жачыка, яны ведаюць, што вясёлы велікодны гурт абавязкова зойдзе ў кожны двор з добрымі словамі:



*Дазвольце пажадаць вам*
*Долі, шчасця, здароўя,*
*Як у зялёнага дуба,*
*Каб заўсёды жылі вы люба!*
*Дай Божа,*
*добрыя гаспадары,*
*Унукаў і ўнучак гадаваці,*
*Праўнукаў прыждаці*
*і дамы будаваці...*

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**

*Любанскі раён.*



■ На адлегласці

# У БАНК МОЖНА НЕ ХАДЗІЦЬ

## Пакуль толькі прэміум-кліентам, але з часам і абсалютна кожнаму

**Прынята лічыць, што рознічны, або рытэйлавы, банк з'явіўся недзе ў XII стагоддзі. Існаваў у той час у Еўропе рыцарскі ордэн тампліераў. Многія памятаюць з гісторыі, што іх каталі як ерэтыкоў, каб даведацца, дзе яны схавалі свае грошы. Аднак як тампліеры гэтыя грошы зарабілі і імі распараджаліся, вядома не ўсім. А адбывалася ўсё так. Паломнікі з Еўропы, якія здзяйснялі паход у Святую зямлю — у Іерусалім, на шляху сваім пакутавалі ад нападаў і рабаванняў. Каб вырашыць гэту праблему, ордэн прыдумаў наступную схему: скажам, жыхар Рыма пакідаў грошы ў «офісе» ордэна ў сваім горадзе і пступова на шляху ён мог атрымліваць манеты ў іншых «офісах», маючы пэўны пароль. Такім чынам зніжалася рызыка страты грошай. Паступова сфера дзейнасці пашыралася. Ордэн стаў настолькі папулярным «банкам», што, акрамя пераводу грошай, пачалі іх пазычаць. Кліентамі тампліераў былі вельмі ўплывовыя людзі, уключаючы каралёў. Пасля страты ордэнам падтрымкі Папы Рымскага не прыдумалі нічога лепшага, як абвясціць тампліераў ерэтыкамі. Аднак грошы ордэна, нягледзячы на катаванні, ніхто так і не знайшоў.**



**Тампліеры не толькі добра ваявалі, але і нядрэнна лічылі грошы. Іх лічаць першымі банкірамі.**

### САМЫЯ АКТЫЎНЫЯ

Гісторыя сумная, але яскрава паказвае сутнасць банкаўскага бізнесу, якая дагэтуль не змянілася. Папершае, гэта захаванне грошай сваіх кліентаў і выдача іх пры неабходнасці. Па-другое, нераскрыццё канфедэнцыяльнай інфармацыі (нагадаю, што грошы ніхто не знайшоў). Змены адбываюцца толькі ў форме абслугоўвання. Калі яшчэ гадоў 10-20 таму безнаяўна нельга было расплаціцца нават у буйных крамах, а без візіту ў банк немагчыма было ўзяць крэдыт ці адкрыць дэпазіт, то цяпер можна з дому не выходзіць і рабіць ўсё што заўгодна. Некаторыя банкі ў свеце ўжо не маюць аддзяленняў. Мы, вядома, наўрад ці да такога прыйдзем у бліжэйшай будучыні — і з-за менталітэту (славяніну патрэбны асабістыя стасункі), і з-за непадрыхтаванасці ўсяго насельніцтва да гэтага.

Днямі Пріорбанк першым на беларускім рынку запусціў новую праграму аддаленага абслугоўвання Premium Direct для кліентаў — фізічных асоб прэміяльнага сегмента. «Мы разумеем, што тэмп жыцця паскараецца з кожным днём. А прэміяльныя кліенты найбольш усприимальныя да інавацый і лічбавых тэхналогій. Нядаўна мы праводзілі апытанне, і 41% апытаных адзначыў хуткасць абслугоўвання як найбольш важны фактар», — заявіў **Сяргей ШЫШОЎ, намеснік старшыні праўлення Пріорбанка.**

Новая паслуга — гэта практычна тое ж самае, што і Premium Banking. Розніца толькі ў тым, што банкаўскае абслугоўванне ажыццяўляецца на адлегласці. Кансультацыі персанальнага менеджара, паслугі фінансавага планавання, афармленне крэдыту, выпуск банкаўскай плацежнай карткі і шмат іншага адбываецца з дапамогай інтэрнэту, тэлефона, электроннай пошты і кур'ерскай службы. Гэта паслуга ўжо працуе ў банках групы «Райффайзэн» у Расіі, Славакіі, Харватыі, Босніі і Герцагавіне.

### ТРАДЫЦЫІ АДЫХОДЗЯЦЬ

Сёння традыцыйнае банкаўскае абслугоўванне заканамерна трансфармуецца ў лічбавы банкінг. Гэта пацвярджае і статыстыка банка. За апошнія некалькі гадоў агрэгні тэмп росту далучэнняў да сістэм дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання — 35,8% у год, а штогадовае зніжэнне колькасці наведванняў кліентамі аддзяленняў банка складае 3%. І гэтая тэндэнцыя толькі ўмацоўваецца. Пра ўсё гэта стала модна казаць: банк — гэта не тое, куды вы ходзіце, а тое, што вы робіце. «Праз 5 гадоў 60-70% нашых даходаў будуць ісці ад дыстанцыйных каналаў. Тым больш што такі від абслугоўвання скарачае выдаткі. Хоць філіялы застануцца заўсёды — ёсць тыя, хто будзе жадаць прыходзіць у банк», — лічыць **выканаўчы дырэктар «Райффайзэн Банк Інтэрнэшнл» па пытаннях Premium & Private Banking Алексіс КАР.**

Premium Direct дзейнічае так: за кожным кліентам замацаваны персанальны менеджар і па ўсіх пытаннях трэба звязвацца з ім. Адзін менеджар па стандарце можа мець да 500 кліентаў. Сёння стасункі з кліентам адбываюцца па тэлефоне, праз інтэрнэт-банкінг ці электронную пошту. Дакументы кліенту для падпісання дастаўляе кур'ер. Банк спецыяльна не выкарыстоўвае праграмнага забеспячэння для відэазванкоў, якое прадастаўляецца бясплатна, бо такія сістэмы не гарантуюць канфедэнцыяльнасць. Аднак банк працуе над стварэннем сваёй сістэмы відэаканферэнцый. А таксама будзе ўкаранёная сістэма гукавой біяметрычнай ідэнтыфікацыі.

### НЕ ХАПАЕ ЗАКАНАДАЎСТВА

Дарэчы, кліентам прэміяльнага абслугоўвання (а значыць, і новай паслугі) можна стаць, калі сярэднямесячны заробак складае больш за 1 тысячу еўра ў эквіваленце ці калі астача на рахунку складае не менш за 30 тысяч еўра ў эквіваленце. Сёння толькі 1% ад усіх кліентаў Пріорбанка карыстаецца прэміум-абслугоўваннем. «Каб такія паслугі распаўсюджваліся на ўсіх кліентаў, у Беларусі не хапае заканадаўчай базы — няма электронна-лічбавага подпісу для фізічных асоб», — сказала **дырэктар дэпартамента па працы з прыватнымі кліентамі Пріорбанка Іна ЗАБІРАН.** Але банк мае ў планах пашырэнне дзеяння дыстанцыйнага абслугоўвання на большую колькасць кліентаў.

Думаю, што, хутчэй за ўсё, з часам усе беларускія банкі пойдуць у тым жа кірунку. Кліенты (і не толькі прэміум-сегмента) становяцца ўсё больш патрабавальнымі і эканомнымі адносна свайго часу.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■

■ Лёгкая прамысловасць

# Наш лён зацікавіў Кітай

## А яшчэ спрабуем прабіцца на рынкі Амерыкі і Афрыкі

**«Беллегпрам» за 2014 год скараціў вытворчасць прадукцыі ў параўнанні з папярэднім годам, але нельга сказаць, што ён змяншае свае тэмпы росту. Сёлета канцэрн працягне мадэрнізацыю на шэрагу прадпрыемстваў, а таксама будзе імкнуцца разумна дыверсіфікаваць экспартныя пастаўкі. Цікавы і той факт, што прадпрыемствамі айчыннай лёгкай прамысловасці зацікавіліся кітайскія інвестары, і гэта не зважаючы на тое, што ў Кітаі і свайго «дабра» хапае.**

### НЕ СПЫНЯЦЦА НА СТРАТАХ

Прадпрыемствы «Беллегпрама» за апошнія тры месяцы 2014 года стацілі больш за 70 млн долараў на курсавой розніцы.

**Адходы лёну будуць выкарыстаны для вытворчасці прадукцыі, якая запатрабавана ў Кітаі.**

«Значныя складанасці пачаліся ў канцы 2014 года ў сувязі з рэзкай дэвальвацыяй расійскага рубля. У Расію мы пастаўляем каля 80% ад агульнага аб'ёму экспарту», — адзначыў **намеснік старшыні канцэрна «Беллегпрам» Вікенцій АДАМОВІЧ.**

Паводле яго слоў, перад «Беллегпрамам» стаіць задача дыверсіфікаваць экспартныя пастаўкі. Для гэтага канцэрн дзейнічае сумесна з Міністэрствам замежных спраў і беларускімі пасольствамі. Праца вядзецца з рынкамі Паўднёвай і Паўночнай Амерыкі, Афрыкі, нават робяцца спробы канкурыраваць з Паўднёва-Усходняй Азіяй, якая сёння з'яўляецца асноўным вытворцам тавараў лёгкай прамысловасці для ўсёй сусветнай эканомікі. Таксама Вікенцій Адамовіч адзначыў, што летась прадпрыемствы «Беллегпрама» вырабілі прадукцыі на суму 14,5 трлн беларускіх рублёў, што амаль на 8% менш, чым у 2013 годзе. Пры гэтым ён падкрэсліў, што ў мадэрнізацыю ўкладзена больш за 1,15 трлн рублёў, 2/3 ад гэтай сумы пайшло на закупку новага абсталявання. У 2015 годзе мадэрнізацыі таксама надаюць вялікае значэнне. Планам прадугледжана паляпшэнне цэлага шэрагу прадпрыемстваў на суму больш чым 1 трлн рублёў. Па словах намесніка старшыні канцэрна, у першую чаргу мадэрнізуюцца прадпрыемствы, якія з'яўляюцца асновай развіцця ўсёй лёгкай прамысловасці Беларусі — тэкстыльныя і гарбарныя вытворчасці.

«Такое рашэнне прынята ў сувязі з тым, што ў нашай краіне для лёгкай прамысловасці існуюць толькі два віды аднаўляльных рэсурсаў — беларускі лён і скураная сыравіна. Акрамя таго, мадэрнізацыя прадпрыемстваў тэкстыльнай і гарбарнай галін дазволіць выкарыстоўваць айчынную сыравіну для перапрацоўкі на трыкатажных і швейных прадпрыемствах, што дасць магчымасць павялічыць дабаўленую вартасць прадукцыі», — сказаў Вікенцій Адамовіч.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

### АДХОДЫ ПОЙДУЦЬ НА ЭКСПАРТ

На мадэрнізацыю Аршанскага льнокамбіната мяркуецца прыцягнуць крэдыт Экспартна-імпартнага банка Кітая. А гэта каля 51 млн еўра з агульнай сумы ў 61 млн еўра, якая патрэбна.

Па словах намесніка старшыні канцэрна, некалькі кітайскіх кампаній праявілі цікавасць да інвеставання сродкаў у вытворчасць на Аршанскім ільнокамбінаце прадукцыі з ільновалакна. Гэта ўцяпляльнік, ушчыльняльнік. Адходы лёну будуць выкарыстаны для вытворчасці прадукцыі, якая запатрабавана ў Кітаі. Аршанскі льнокамбінат летась завяршыў мадэрнізацыю трэцяй фабрыкі па вытворчасці тонкіх ільняных тканін, удвая павялічыўшы вытворчасць прадукцыі, запатрабаванай на Захадзе. Увогуле прадпрыемства пастаўляе ў далёкае замежжа больш за 80% сваёй тканіны.

Гаворачы аб іншых праектах па мадэрнізацыі, Вікенцій Адамовіч адзначыў, што цяпер у працэсе тэхнічнага пераўзбраення знаходзіцца прадпрыемства «Мінскае вытворчае гарбарнае аб'яднанне», на што будзе накіравана 22,5 млн еўра (на 1 красавіка засвоена трэціна сумы). На мадэрнізацыі Бабруйскага гарбарнага камбіната мяркуецца асвоіць 67,7 млрд рублёў, у 2014 годзе выкарыстана 17 млрд. Прадпрыемства «Баранавіцкае вытворчае баваўнянае аб'яднанне», мадэрнізацыя якога пачалася ў 2012 годзе і скончыцца ў 2015-м, выкарыстае каля 61,2 млн еўра (асвоена 32 млн еўра). Вікенцій Адамовіч таксама расказаў, што распрацаваны праект стварэння новай вытворчасці па выпуску тканін у прадпрыемстве «Камволь». «Спачатку меркавалася мадэрнізаваць «Камволь», асобна — «Сукно». Але потым у працэсе працы было прынята рашэнне гэтыя прадпрыемствы рэарганізаваць і пачаць выпуск камвольных і суконных тканін на плошчы ААТ «Камволь». Мяркуемая сума інвестыцый — 179 мільёнаў еўра», — пракаментаваў Вікенцій Адамовіч.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

■

■ Прэм'ера рубрыкі: вуліцай Героя

# АПОШНІ БОЙ МАЁРА РАМАШКІ



М.В. Рамашка.

## У ім ён знішчыў 200 ворагаў і загінуў сам

**Капыльская зямля дала нашай краіне 11 Герояў Савецкага Саюза. Такой колькасці адважных сыноў Айчыны няма ні ў адным раёне Беларусі. Імем Мікалая Васільевіча Рамашкі ў Капылі названа вуліца. Тут няма адміністрацыйных будынкаў, офісаў. Толькі аднапавярховыя прыватныя дамы. Вакол цішыня: ні машын, ні людзей. І асабліва гулка раздаюцца ў гэтай цішыні галасы дзяцей, што ідуць мне насустрач.**

### НІ КРОКУ НАЗАД

— Ці ведаеце, у гонар каго названа ваша вуліца? — цікаўлюся ў школьнікаў.

— А як жа, — адказваюць наперабой. — У гонар Героя Савецкага Саюза Мікалая Васільевіча Рамашкі. Нам пра яго расказваюць настаўнікі, а ў пазамінулым годзе спойнілася 100 гадоў з дня яго нараджэння. І ў нашай гімназіі ладзілі з гэтай нагоды літаратурна-музычную кампазіцыю.

— На будынку гімназіі ўсталявана мемарыяльная дошка Мікалаю Васільевічу Рамашку, бо калісьці ён тут вучыўся. Ідзіце з намі, мы вам пакажам, тут недалёка — на суседняй вуліцы, — запрашаюць мае дасведчаныя суразмоўцы.

У гімназіі №1 ёсць і невялікі музей славутага земляка.

— Мы б хацелі, каб наша ўстанова насіла імя Мікалая Рамашкі, — гаворыць намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Наталля Лятчэня. — Але для гэтага неабходна сабраць цэлы пакет дакументаў, працягваць пошукавую работу. Такой магчымасці ў нас няма, паколькі даўно пайшлі з жыцця сведкі тых падзей, людзі, якія ведалі Мікалая Васільевіча асабіста.

Нарадзіўся Мікалай Рамашка ў 1913 годзе ў вёсцы Дусаеўшчына Капыльскага сельсавета. У 1932-м скончыў 7 класаў Капыльскай сярэдняй школы (цяпер гімназія №1). Працаваў падлікоўцам на ферме, паляводам, загадчыкам сельскага клуба. У 1935-м яго прызвалі на тэрміновую службу. Менавіта тут ён зарэкамендаваў сябе як дысцыплінаваны чырвонаармеец, добры арганізатар. Гэтыя якасці не засталіся па-за ўвагай камандзіраў. Мікалая накіроўваюць на курсы палітработнікаў. З першых дзён вайны ён на фронце.

У жыцці кожнага чалавека надыходзіць час, калі ён раскрывае свой унутраны змест і душэўную прыгажосць. Такая хвіліна настала і ў жыцці маёра Рамашкі.

— Летам 1944 года зенітна-артылерыйскі полк, дзе намеснікам камандзіра па палітчастцы быў маёр Рамашка, удзельнічаў у вызваленні Беларусі. 30 чэрвеня падраздзяленне палка абараняла чыгуначны мост і пераправу цераз Бярэзіну ад нападу авіяцыі праціўніка. Нашы наземныя войскі вялі бой побач, каля вёсак Кастрычнік і Свіслач (Асіповіцкі раён), дзе трапілі ў акружэнне больш як 6500 нямецкіх салдат, — расказвае навуковы супрацоўнік Капыльскага краязнаўчага музея Андрэй Лятчэня. — Немцы імкнуліся разарваць кольца і пайшлі на прарыў. Бой быў жорсткі. Адзін за адным гінулі байцы, быў цяжка паранены ротны, загінуў камандзір узвода зенітных кулямётаў. Маёр Рамашка прыняў камандаванне на сябе. Калі большасць байцоў, што абаранялі пераправу, загінулі, ён па чарзе касіў ворага з трох кулямётаў, пакуль не падышла дапамога. Нават паранены ён не пакінуў поле бою і загінуў як герой.

Як падлічылі апасля, палітрук знішчыў 200 варожых салдат. Яго подзвіг ацэнены па заслугах: 26 кастрычніка 1944 года Мікалаю Васільевічу Рамашку было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.



Юныя следапыты школы №1 г. Капыль на магіле Мікалая Рамашкі ў Магілёве, 1984 год.

### Я ГАНАРЫЛАСЯ БРАТАМ

Ганна Арлоўская шмат гадоў працавала намеснікам дырэктара сярэдняй школы па выхаваўчай рабоце №1 Капыля. Адначасова з юнымі следапытамі вяла пошукавую работу, збірала матэрыял пра земляка-героя. Дзякуючы Ганне Іосіфаўне стала вядома, што першапачаткова афіцэр-камуніст быў пахаваны ў брацкай магіле ў вёсцы Нясяты Клічаўскага раёна Магілёўскай вобласці, а затым яго астанкі перанесены ў брацкую магілу на вайсковых могілках Магілёва.

У 1984 годзе вучні разам са сваёй настаўніцай пабывалі на месцах гібелі і пахавання Мікалая Рамашкі, сустрэліся з яго сястрой, якая на той час жыла ў Асіповічах.

Былая вучаніца школы, а цяпер настаўніца нямецкай мовы Тацццяна Марукіна добра памятае тыя падзеі 30-гадовай даўніны:

— Спачатку мы перапісваліся з Ганнай Васільеўнай. Затым дамовіліся пра сустрэчу. Яна нас вельмі чакала, пачаставала смачнымі пельменямі ўласнага прыгатавання. Паказала фотаздымкі з сямейнага альбома, расказала пра цяжкае дзяцінства. Мы запісалі яе ўспаміны:

— Жылі мы ў вёсцы Дусаеўшчына ў старым доме з гліняной падлогай. Нягледзячы на тое, што школы ў вёсцы не было, Коля рэгулярна хадзіў на ўрокі ў Капыль. Вучыўся на 4 і 5, рос клапатлівым, працалюбівым, закончыў 7 класаў. Працаваў загадчыкам клуба. Праз некаторы час пайшоў на службу ў Савецкую Армію, пазней стаў кадравым палітработнікам. Быў сціплым, з павагай ставіўся да людзей. Аднавяскоўцы таксама паважалі Мікалая за яго дапытлівы розум, не па ўзросце жыццёвую разважлівасць. Я была намнога маладзейшая за брата, вельмі любіла яго і ганарылася ім. Мы з мамай радаваліся, што служба ў Колі ідзе паспяхова. Радаваліся і таму, што яго дзіцячая мара ажыццявілася, што ён канчаткова вырашыў стаць ваенным, вучыцца ў школе малодшых камандзіраў, што ў арміі яго паважаюць, і ён выбраны камсоргам дывізіёна.



Сустрэча з сястрой Мікалая Рамашкі — Ганнай (другая злева) летам 1984 года.

Маці гадавала дзяцей адна: бацьку забілі белагвардзейцы ў 1922 годзе па дарозе ў Нясвіж. Кажуць, Мікалай рана пабраўся шлюбам. У музеі захаваліся копіі фотаздымкаў з подпісам «на памяць Ніне». А вось яны разам з Нінай Пятроўнай на адпачынку ў Крыме ў маі 1941 года. Шчаслівыя, маладыя, нават і не ўяўляюць, што праз месяц іх назаўсёды разлучыць вайна.

А потым былі пісьмы каханай Ніне. У іх і пяшчота да спадарожніцы жыцця, і непакой за яе, і ўдзячнасць ёй, і нянавісць да чужынцаў.

### КАХАННЕ САГРАВАЛА Ў НЕПАГАДЗЬ

«Сёння ўвесь дзень лье дождж, гэты надакучлівы спадарожнік жыцця Ленінградскай вобласці. Учора хадзіў у чарніцы і ўвесь вымак. Але чарніц тут шмат.

З-за дажджлівага надвор'я наступіла абсалютная цішыня. Калі б не папялішча спаленай немцамі вёскі, не павыбіваныя вокны ў цудам ацалелай школе, то цяжка было б падумаць, што зусім побач фронт (акопы, бліндажы, дзоты, дрот, і гэтыя немцы, іх паганыя морды, пахабныя паводзіны). Цемра, гвалт і здзекі з мірных жыхароў нашай Радзімы.

Ну нічога. Яны пруцца на поўдзень, але хутка настане час, калі пабягуць з поўдня на захад, з паўночнага захаду і поўначы, ды пабягуць без супыну. Калі цяпер іх б'юць тысячамі, як мух, то хутка мы будзем біць іх дзясяткамі тысяч, каб ніводная погань нямецкая не змагла дайсці да свайго логава» (25.07.1942).

«Я вельмі рады, што маё пісьмо прыйшло да цябе ў дзень Вялікага Кастрычніка, што яно прынесла табе радасць. Ты пытаешся, што мне патрэбна. Я скажу: «Мне трэба, каб ты гэтую зіму магла правесці ў добрых умовах, каб у цябе былі зімовы абутак і адзенне, каб ты ніколі не забывала, што тут дзесьці далёка-далёка з немцамі змагаецца твой сябар, які хоча хутчэй разбіць ненавіснага ворага і вярнуцца да цябе, мая дарагая. Каб вясна была не толькі вясной кветак і зелянін, а і вясной перамогі, вясной нашай сустрэчы.

А што тычыцца матэрыяльных патрэб, то я забяспечаны ўсім, за што дзякуй Радзіме, якая так любоўна клапоціцца пра нас, яе абаронцаў.

Ведаю, хвалюешся, што б мне прыслаць: пальчаткі ці шкарпэткі. Я буду сардэчна табе ўдзячны. І не столькі за рэчы, колькі за тваё каханне і клопат. Я іх буду берагчы як самыя дарагія прадметы, надзяваць буду толькі ў самыя моцныя маразы, каб тваё каханне саграваля і ў непагадзь, і калі буду ісці ў бой, каб яны, як талісман, натхнялі мяне на подзвіг і прыводзілі да перамогі над ворагам» (24.11.1942).

«Добры дзень, дарагая Ніна. Сёння ўсё яшчэ знаходжуся ў Маскве. Ты, мабыць, на мяне ўжо сварышся: на фронце з кожным днём разгортваюцца ўсё больш цікавыя падзеі, а я сяджу ў Маскве. Мне таксама гэта не падабаецца. Мне хочацца як найхутчэй на фронт, біць немцаў. Праўда, Пурыгін і Еўдакімаў кажуць, што я маю поўнае права пажыць у сталіцы пасля 18 месяцаў бесперапыннага знаходжання на фронце. Мне здаецца, што неўзабаве атрымаю прызначэнне.

Глядзеў спектакль «На дне» і канцэрт майстроў беларускага мастацтва. На фільм «Чакай мяне» чытаў толькі рэцэнзію; пабачу яго, відаць, не хутка, а вось верш « Чакай мяне», які ты даслала, прачытаў» (28.01.1944).

У 1984 годзе Ніне Пятроўне даслаў пісьмо член Саюза журналістаў СССР, падпалкоўнік у адстаўцы Міхаіл Фядотавіч Арцёменка. Ён паведамляў, што напісаў нарыс «Да апошняга патрона», у якім расказаў пра подзвіг Мікалая Васільевіча Рамашкі. Нарыс падрыхтаваны па матэрыялах, што захоўваюцца ў Цэнтральным архіве Савецкай Арміі ў Падольску. «У нарысе могуць быць недакладнасці, прашу вас і блізкіх уважліва прачытаць яго і ўнесці змены і дапаўненні, якія лічыце патрэбнымі», — прасіў журналіст. А заадно цікавіўся, ці ёсць у Мікалая Васільевіча дзеці.

У Капылі не ведаюць, дзе згубіліся сляды жонкі Героя. Але дакладна ведаюць, што дзецьмі сужэнцы не паспелі абзавесціся. І вось нядаўна на вочы выпадкова трапіў нумар «Варшаўскага кур'ера» за сакавік 2003 года, дзе зацікавіла публікацыя пад рубрыкай «Расіяне ў Польшчы». Цытую: «Вольга ад'язджала пасля чарнобыльскай аварыі асэнсавана. Пакідала горад, у якім яе прозвішча было вядома ўсім, таму што імем яе айчыма, Героя Савецкага Саюза Рамашкі М.В. у Магілёве названа вуліца і школа. Там усталяваны яму помнік і сабраны дакументы ў краязнаўчым музеі. Яна забрала з сабой 5-гадовага сына і ўспаміны пра блізкага чалавека, што загінуў пры абароне чыгуначнага моста цераз раку Бярэзіна».

Вольга Рамашка (дачка Ніны ад першага шлюбу) нарадзілася ў Магілёве. Закончыла тэарэтыка-кампазітарскае аддзяленне Астраханскай дзяржаўнай кансерваторыі. Да прыезду ў Польшчу выкладала тэорыю і фартэпіяна ў Магілёўскім вучылішчы культуры, давала канцэрты. З 1990 года жыве ў Варшаве. Як прызнаецца, пачынала жыццё на новым месцы «пад крылом сваёй мамы».

**Тацццяна ЛАЗОЎСКАЯ** ■

# ТАННА І ЯШЧЭ ТАННЕЙ...



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

А пры максімальнай прапанове і мінімальным попыце патэнцыяльныя пакупнікі ўвогуле пачынаюць прытрымлівацца чакальнай пазіцыі. І гэта сёння лагічна, бо праз месяц падобную кватэру на рынку можна будзе набыць яшчэ танней.

## ЗАВАРУШЫЛАСЯ ТОЛЬКІ ТРАЦІНА ПРАДАЎЦОЎ

На фоне мінімальнага попыту на стандартнае і элітнае жыллё сёння бескватэрныя кліенты шукаюць выключна танныя варыянты. Цяпер яны праглядаюць усе прапановы, а потым спрабуюць істотна знізіць кошты нават на даволі якаснае жыллё. Калі гаспадару неабходна тэрмінова прадаць сваю кватэру, то ўзровень зніжкі можа скласці да 2-3 тысяч долараў у эквіваленце. Разам з тым Мікалай Прасталупаў адзначае, што амаль палова гаспадароў кватэр працягвае трымаць на іх нерэальныя цэны, каля 20% кватэр маюць у каталогу прапановы кошт, набліжаны да рыначнага, і толькі 30% уласнікаў жылля цяпер мяняюць свае цэннікі бадай штотыдня.

**Сярэдні кошт квадратнага метра аднапакаёвых кватэр у каталогу прапановы складае цяпер прыкладна 24,2 млн рублёў.**

За апошні месяц крыху змянілася і структура прапановы памяшканняў на продаж. Да гэтага часу адна- і двухпакаёвыя кватэры мелі амаль аднолькавыя долі (каля 30%) у каталогу прапановы, а астатнія 40% прыпадала на шматпакаёвыя кватэры і асобныя жылыя памяшканні. Цяпер доля аднапакаёвых кватэр павялічылася да 40%, двухпакаёвых знізілася да 25%, а астатнім катэгорыям засталося 35% ад агульнай колькасці прапановы.

## АДНАПАКАЁЎКІ — УЖО КАЛЯ 580 МЛН РУБЛЁЎ

Гэта сапраўды знакавая мінімальная сума продажу, прыкладна эквівалентная 40 тысячам замежных у. а. Адразу такое слабенькае жыллё прапануецца даражэй, аднак пры продажы памер канчатковых зніжак можа дасягаць 29-43 млн рублёў. Заўважу, што сёння, на фоне ўмацавання рубля да долара і агульнай тэндэнцыі на рынку, кошты кватэр на другасным рынку пачынаюць зніжацца менавіта ў айчыннай валюце.

Разам з тым сапраўды танных аднапакаёвых кватэр цяпер на рынку не так і шмат. Прысутнічае каля двух дзясяткаў маленькіх кватэр з цэннікам да 650 млн рублёў, яшчэ недзе 40 кватэр прапануюцца ў дыяпазоне да 720 млн рублёў (прыкладна 50 тысяч у. а.). Далей прысутнічаюць ужо сотні кватэр з коштам прапановы ад 750 млн да 870 млн рублёў. Сапраўды якасныя і прасторныя аднапакаёўкі каштуюць цяпер да 1 млрд рублёў і нават даражэй.

Сярэдні кошт квадратнага метра аднапакаёвых кватэр у каталогу прапановы складае цяпер прыкладна 24,2 млн рублёў. Толькі за апошні тыдзень гэты метр патаннеў на 150 тысяч рублёў. Аднак пры рэальных здзелках такі сярэдні цэннік можа істотна адрозніваццa ад канчатковага кошту «квадрата». Цяпер звычайна людзі набываюць кватэры толькі ў тым выпадку, калі квадратны метр агульнай плошчы жылля каштуе ад 20 да 21 млн рублёў.

## ДВУХПАКАЁЎКІ МОЖНА АДШУКАЦЬ І ЗА 690 МЛН

Такі мінімальны цэннік двухпакаёвых кватэр цяпер адпавядае 48 тысячам у. а. Звычайна па такім кошце на рынку прапануюцца кватэры на крайніх паверхах з агульнай плошчай жылля да 38 квадратных метраў. Падобнае таннае жыллё ў каталогах доўга не затрымліваецца. Не вельмі вялікі выбар двухпакаёвых кватэр існуе і ў дыяпазоне ад 720 млн да 865 млн рублёў (50-60 тысяч у. а.). Большасць варыянтаў стандартных двухпакаёвак у панэльных дамах адпавядае цэннікам прапановы ад 1 млрд да 1,15 млрд рублёў. Зразумела, што сярод іх хапае дастаткова ліквідных кватэр, дзе якасць і метраж памяшканняў адпавядае кошту, але вялікі цэннік у нацвалюце неяк адпужвае патэнцыяльных пакупнікоў.

Мінімальны кошт трохпакаёвых кватэр складае цяпер каля 820 млн рублёў. Толькі за мінулы месяц такая катэгорыя жылля страціла ў стартавых цэнніках каля 140 млн рублёў. Падобныя кватэры нават у замежнай валюце таннелі за гэты час мацней за ўсё, больш за тое, умоўная адзінка «прасела» адразу на некалькі соцень рублёў. У катэгорыю слабенькіх трохпакаёвых кватэр трапляюць жылыя памяшканні з агульнай плошчай ад 55 да 60 квадратных метраў. У падобных кватэрах звычайна суменыя пакоі, і знаходзяцца такія памяшканні на крайніх паверхах пяціпавярховых дамоў.

Сярэдні кошт невялікіх бюджэтных трохпакаёвак складае на рынку сёння да 1,2 млрд рублёў. Самая вялікая колькасць прапановы стандартных трохпакаёвак прыпадае на кватэры коштам ад 1,2 да 1,4 млрд рублёў. Якасныя трохпакаёвыя кватэры плошчай да 80 квадратных метраў прапануюцца на другасным рынку па кошце ад 1,35 да 1,72 млрд рублёў.

## ВЫМУШАНЫЯ ЗНІЖКІ АД ЗАБУДОЎШЧЫКАЎ

Цяпер на першасным рынку сталічнага жылля існуе шмат цікавых прапаноў і акцый непасрэдна ад арганізатараў будаўніцтва. Зразумела, што танней за ўсё па лініі долевага будаўніцтва прапануюцца кватэры ў дамах, узвядзенне якіх толькі арганізуецца — на стадыі катлавана. Напрыклад, у будучым доме жылога комплексу па вуліцы Максіма Багдановіча квадратны метр агульнай плошчы прапануецца сёння па кошце, які пачынаецца ад 15,12 млн рублёў. Атрымліваецца, што толькі за месяц жыллёвы «квадрат» патаннеў на 630 тысяч рублёў. Прапанова і сапраўды цудоўная, калі не ўлічваць той факт, што дом будзе здадзены ў эксплуатацыю не раней апошняга квартала 2016 года. Больш за тое, цяпер гэты забудоўшчык прапануе сваім будучым кліентам растэрміноўку да 24 месяцаў.

Гэтымі днямі адна камерцыйная кампанія зладзіла акцыю па продажы невялікіх кватэр у жылым комплексе «Вясёлка», які знаходзіцца на адлегласці 8 кіламетраў ад МКАД, у аграгарадку Прылукі. Кошт квадратнага метра аднапакаёвых і двухпакаёвых кватэр у гэтым комплексе па акцыі складзе адпаведна ад 13,68 млн да 12,24 млн рублёў. Умовы акцыі распаўсюджваюцца на першыя 10 кватэр, дзе агульная зніжка па жылым памяшканні складае ад 58 да 144 млн рублёў. І падобныя акцыі для заваблівання кліентаў арганізуе амаль кожная другая структура долевага будаўніцтва. З чым гэта звязана? Няўжо прыватныя арганізацыі ўсе разам пераўтварыліся ў так званага «добрага дзядзьку»?

Аналітыкі рынку жыллёвай нерухомасці ў дабрыню камерцыйных арганізацый не вераць. Аб практычна нулявым попыце самі забудоўшчыкі адкрыта не гавораць, бо баяцца спужаць рэдкіх пакупнікоў, у якіх ёсць грошы і няма жадання чакаць дна коштаў. Паралельна многія сапраўды зніжаюць кошт квадратнага метра і ў валюце, аднак называюць такія мерапрыемствы акцыямі. Але ўжо ў прыватных размовах кіраўнікі кампаній згаджаюцца, што на попыт зніжка ў 1,5 ці нават 3 млн рублёў уплывае слаба. Пакупнікі чакаюць. І разварушыць іх змогуць толькі «новыя» (чытай — вялікія) заробкі ці даступныя і танныя крэдыты.

## СПАД ПРАЦЯГНЕЦЦА МІНІМУМ ДА СЯРЭДЗІНЫ ЖНІЎНЯ

Патанненне кватэр на сталічным другасным рынку жылля прагназуецца нашым экспертам да другой паловы жніўня або да першых дзён восені. Мікалай Прасталупаў чакае зніжэння коштаў ужо ў ліпені да знакавага паказчыка, калі квадратны метр агульнай плошчы кватэр складзе ў межах да 17,2 млн рублёў. Тут трэба адразу заўважыць, што такое патанненне не адразу адаб'ецца на ўсіх сегментах рынку. Спачатку ўпэўнена будзе зніжацца кошт жылых памяшканняў у тых уласнікаў (іх доля ў аб'ёме прапановы каля 30%), якія і цяпер у рэжыме рэальнага часу карэктуюць свае цэннікі. Потым да гэтага ўзроўню падцягнуцца і тыя (каля 20%), хто пераглядае кошты адзін раз на 1-2 месяцы.

Менавіта ў жніўні наш эксперт чакае гранічных мінімальных коштаў на другасным рынку, а таксама і ў сегменце камерцыйнага будаўніцтва, дзе падзенне коштаў прагназуецца нават мацнейшае. На яго погляд, самыя слабенькія па якасці кватэры ў загазаваных мікрараёнах або ў старых дамах будуць прапаноўвацца тады па цэнах, дзе метр стане каштаваць у межах 15-16 млн рублёў.

**На попыт зніжка ў 1,5 ці нават 3 млн рублёў уплывае слаба. Пакупнікі чакаюць. І разварушыць іх змогуць толькі «новыя» (чытай — вялікія) заробкі ці даступныя і танныя крэдыты.**

Менавіта такі сярэдні кошт жыллёвага «квадрата» з'яўляецца адэкватным для пакупнікоў з сённяшнімі невялікімі заробкамі, упэўнены наш эксперт. Толькі па такім цэнніку на другасным рынку сталіцы гэтым летам кліенты рэальна будуць набываць стандартныя кватэры.

Спадар Прасталупаў лічыць, што і ў камерцыйным будаўніцтве мінімальны попыт будзе і надалей кіраваць коштамі. Паводле прагнозаў спецыяліста, бліжэй да восені мінімальны кошт прапановы ў гэтым сектары ў памеры 12-15 млн рублёў больш не будзе сур'ёзным выключэннем на агульным цэнавым фоне.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ■ Факты. Падзеі. Каментарыі

### Да доктара — без чаргі

**З красавіка ў філіяле № 2 Гомельскай гарадской цэнтральнай паліклінікі вядуцца анлайн-кансультацыі. Загадчыкі аддзяленняў медыцынскай установы з 13 да 14 гадзін у любы дзень, акрамя серады і выхадных, прымаюць пацыентаў па Skype. Для гэтага абсталявалі асобны кабінет.**

Кіраўнік установы Наталля Дзмітрыева перакананая, што ўкараненне гэтай бясплатнай паслугі вырашае адразу некалькі задач:

— У пацыента з'явілася магчымасць на адлегласці атрымаць кваліфікаваную параду ў выпадках удакладнення ці пацвярджэнні дыягназу, расшыфраваць вынікі даследаванняў і аналізаў. Таксама чалавек можа пракансультавацца ў спецыялістаў вузкага профілю: гінеколага, рэабілітолага і іншых.

На прыём да доктара з дапамогай інтэрнэт-тэхналогій неабходна запісвацца загадзя, звязаўшыся з каардынатарам. Пасля патэлефанаваць па Skype ў абедзенны перапынак. Медыкі спадзяюцца, што новая паслуга дазволіць «прасунутым» пацыентам значна эканоміць час, які яны б маглі правесці ў чарзе да доктара.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### «Прывітанне, дрэва!»

**Конкурс пад такой назвай, прымеркаваны да Міжнароднага дня Зямлі 22 красавіка, праводзіць для чытачоў Зялёны партал.**

Для ўдзелу ў ім трэба да вышэйназванай даты адшукаць у сваёй мясцовасці дрэва, якое адыграла важную ролю ў вашым жыцці (пад ім вы першы раз пацалаваліся; тут у вас з'явілася нейкая цудоўная ідэя або адбылася сустрэча з цікавым чалавекам; магчыма, гэтае дрэва пасадзіў ваш бацька і тым яно вам асабіста дарагое). Або гэта дрэва, якое адыграла важную ролю ў гісторыі вашай мясцовасці: яго пасадзіў знакаміты зямляк ці, можа быць, пад ім адпачываў Напалеон. Магчыма, у яго цені вядомы паэт напісаў свае найлепшыя радкі. А можа, дрэва незвычайнае, бо самае высокае ці яму вельмі шмат гадоў. Ці яно самае прыгожае. У ім нехта жыве ці ёсць іншая цікавая гісторыя.

Дрэва трэба сфатаграфаваць і да 22 красавіка ўключна адправіць фатаграфію па пошту greenbelarus.editor@gmail.com з апісаннем таго, чаму вы выбралі менавіта яго. Таксама трэба ўказаць, дзе расце тое дрэва. Усе гісторыі і здымкі будуць апублікаваны на Зялёным партале, а найлепшыя — адзначаны прызамі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### Людзі працягваюць здаваць валюту

**У сакавіку нашы грамадзяне, згодна са статыстычнымі звесткамі Нацыянальнага банка, прадалі валюты на 255,29 млн долараў больш, чым купілі. Такая ж сітуацыя назіралася і ў лютым.**

Фізічныя асобы за сакавік прадалі наяўнай і безнаяўнай валюты на 745,92 млн долараў (за 3 месяцы — 1 млрд 624,69 млн) у эквіваленце, купілі 490,63 млн (1 млрд 343,94). Такім чынам, чысты продаж замежнай валюты за сакавік склаў 255,29 млн. У лютым чысты продаж склаў 55,62.

Суб'екты гаспадарання — рэзідэнты Беларусі за сакавік прадалі замежнай валюты на 1 млрд 641,03 млн долараў (за 3 месяцы 4 млрд 501,61 млн) у эквіваленце, набылі — 1 млрд 581,8 млн (4 млрд 500,52 млн). Чысты продаж склаў 59,23 млн. У лютым чысты продаж склаў 8,73 млн.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

### Усё аб прыёмнай кампаніі — у тваім смартфоне

**Спецыяльны сайт для абітурыентаў распрацаваны ў БДУ www.abiturient.bsu.by. З яго дапамогай абітурыенты змогуць вызначыцца са спецыяльнасцю, сабраць неабходны для паступлення пакет дакументаў і атрымаць адказы на ўсе пытанні, якія тычацца ўступнай кампаніі.**

— Белдзяржуніверсітэт — буйны вучэбны і навукова-вытворчы комплекс. У інтэрнэце прадстаўлены фактычна кожны напрамак яго дзейнасці. Таму абітурыенту бывае складана зарыентавацца ў вялікім патоку звестак і знайсці тое, што цікавіць менавіта яго. Таму наспела патрэба стварыць асобны інфармацыйны сэрвіс для абітурыентаў, — пракаментаваў ідэю **начальнік медыяцэнтра БДУ Павел САЛАЎЁЎ**. — Быў створаны просты і прывабны інтэрфейс з карыснай інфармацыяй, прызначанай для тых, хто плануе паступаць у наш універсітэт. Немалаважна, што сайт адаптуецца і пад прагляд на планшэтах і смартфонах, паколькі за апошні год паток зваротаў да раздзела «Абітурыент» сайта БДУ з мабільных прылад вырас у 2 разы.

Адна з адметнасцяў сайта — сэрвіс «Выбар спецыяльнасці», які дазволіць старшакласнікам выбраць спецыяльнасць з улікам прадметаў цэнтралізаванага тэсціравання і зыходзячы з кваліфікацыі, што будзе прысвоена пасля заканчэння вучобы. Найменні кваліфікацый прыводзяцца згодна з Агульнадзяржаўным класіфікатарам Рэспублікі Беларусь «Спецыяльнасці і кваліфікацыі».

Яшчэ адна перавага сэрвісу — каляндар абітурыента. Тут размешчана інфармацыя пра дні адчыненых дзвярэй, графікі правядзення рэпетыцыйнага і цэнтралізаванага тэсціравання, факультэцкія падзеі і мерапрыемствы для тых, хто збіраецца паступаць.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### Смяротна параніў дзяржінспектара...

**У Талачынскім раёне падчас прыродаахоўнага рэйду загінуў дзяржінспектар.**

Група Аршанскай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету разам з егерамі Талачынскай раённай структуры Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў праводзіла палявое кантрольнае мерапрыемства. Ранкам паблізу вёскі Пятроўш адбылася затрыманне ўзброенага браканьера. Старшы дзяржаўны інспектар, маючы добрую фізічную падрыхтоўку, атрыманую падчас службы ў арміі, а потым у органах унутраных спраў і аэраклубе, першым дагнаў парушальніка. Уцякаючы ад пераследу, браканьер смяротна параніў дзяржінспектара, які ад атрыманых ран памёр на месцы. Мужчына быў 1970 года нараджэння... З месца здарэння страляўшы збег. Напарнік загінулага паведамі у праваахоўныя органы прыкметы злачынцы, які быў аператыўна затрыманы праваахоўнікамі. Ім аказаўся жыхар Талачына 1960 года нараджэння.

Заведзена крымінальная справа за забойства службовай асобы пры выкананні ёй службовых абавязкаў. Як удакладнілі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, у загінулага калегі засталіся маці, жонка і дзве дачкі 1993 і 2008 гадоў нараджэння.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Я веру толькі ў гэта!

## Пра што Вера Брэжнева расказала моладзі?




**Расійская спявачка і тэлевядучая Вера Брэжнева сустрэлася ў Мінску з падлеткамі, якія прапагандуюць тэму здаровага ладу жыцця сярод равеснікаў — праз асабістыя кантакты, кансультаванне і сацыяльныя сеткі, а таксама ўдзельнічаюць у прафілактычнай рабоце ў галіне ВІЧ у якасці валанцёраў. Сустрэча прайшла ў межах першага прыезду ў Беларусь Веры ў якасці пасла добрай волі Аб'яднанай праграмы ААН па ВІЧ/СНІДу (ЮНЭЙДС) у рэгіёне Усходняй Еўропы і Цэнтральнай Азіі.**

Журналістам Вера паведаміла, што з асаблівай цеплынёй ставіцца да Беларусі, радуецца поспехам нашай краіны ў барацьбе з ВІЧ, а яшчэ цалкам і ўсёй душой падтрымлівае сямейныя каштоўнасці і пачуццё сапраўднай любові ў сем'ях. У якасці пасла добрай волі Вера наведала ўжо шэсць краін згаданага рэгіёна.

Размова беларускіх маладых людзей са спявачкай-паслом адбылася ў канферэнц-зале гатэля «Рэнесанс». Хлопцы і дзяўчаты падрыхтавалі не толькі свае пытанні, але і харавы спеў! Вера пазнала песню з першай ноты:

*«Я знаю пароль, я вижу*
*ориентир,*
*Я верю только в это,*
*любовь спасет мир».*

Дарэчы, для сустрэчы бландзінка выбрала адзенне (сукенка, панчохі, туфлі) аднаго — чорнага — колеру. Аднак калі яна пачала гаварыць, то ўсё навокал «заззяла» — столькі ў ёй пазітыву і станоўчых эмоцый! Прысеўшы на крэсла, пачала з жартаўлівага «Калі хто не ведае... Мяне завуць Вера і мне 33 гады!». Прысутныя сустрэлі гэта дружным смехам і сцішыліся, паколькі далей маглі ісці невядомыя ім падрабязнасці.

